Сувальшчына ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

СУМНЫ ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 20 (2766) Год LIV | Беласток, 17 мая 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Размова з Мікалаем Бушко — дырэктарам Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2009”

Кожны год як юбілей

— Перад намі XXVIII Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2009”. Шмат фестываляў, шмат часу. Не адчуваеце стомленасці?

— Думаю, што не. Кожны фестываль іншы, тым больш што першыя конкурсы, калі мы запрашалі хары, якія прыязджалі без ніякай ідэі — гэта наша мінулае. Галоўнае, з чаго пачыналі ў 1982 годзе — паказаць нашым праваслаўным, што царкоўная музыка ды праваслаўе гэта цэлы свет — ужо давялося зрабіць. Хачу сказаць і гэта не мае словы, што фестываль „Гайнаўка”, бо такую назву мае ён з самога пачатку, дазволіў праваслаўным падняцца з каленяў. Зараз паказваем царкоўную музыку ў месцы, дзе яна ўжо вядомая, але яе папулярызацыі ў розных асяроддзях Беластока ніколі зашмат. Прапануем музыку кампазітараў, якія ніколі не гучалі ў цэрквах. Маем за сабой прэзентацыі літургій Аляксандра Грачанінава і Пятра Чайкоўскага, творы славутага англійца Джона Тавенера, кампазіцыі Кшыштофа Пэндэрэцкага, у тым ліку „Гімн святому Данілу”, „Херувімская песня” ці славутая „Ютрань”. Прыгадваем таксама, што царкоўную музыку пісалі польскія кампазітары, напрыклад, Станіслаў Манюшка, Караль Шыманоўскі ці Міхал Рагоўскі, звязаны з віленскім беларускім асяроддзем і Янкам Купалам. У гэтым годзе вырашылі мы пакланіцца кампазітарам Украіны. У галіне харавой музыкі гэта зараз магутнасць. Там менавіта вырасла пакаленне сучасных кампазітараў, якія пішуць цудоўную царкоўную музыку, напрыклад, Лэся Дзічко. Сёлета адзначаем яе 70-гадовы юбілей, а таксама гадавіны звязаныя з асобай Канстанціна Горскага, ураджэнца Ліды, вучня Мікалая Рымскага-Карсакова, сябры Чайкоўскага ды аўтара оперы, дзея якой адбываецца ў Вялікім Княстве Літоўскім.

— Ці сёлета фестываль будзе вандраваць па ўсёй Польшчы?

— Стараемся прытрымлівацца традыцыі, таму адбудуцца канцэрты ў Кракаве. У базіліцы айцоў францысканцаў заспявае Дзяржаўны камерны хор сухапутных войск Украіны, а ў самім прэстыжным месцы, у Мар'яцкім касцёле выступіць хор „Cantus Juventae” Дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ў Мінску, дзякуючы якому колькі нашых маладых людзей зрабіла і робіць сёння міжнародныя кар'еры. Таксама Евангеліцка-Аўгсбургскі касцёл у Варшаве васемнаццаты (!) раз прыме знакамітых гасцей, між іншым з Масквы і Будапешта. Царкоўная музыка прагучыць таксама ў базіліцы ў Венграве, а таксама традыцыйна ўжо ў Белавежы, дзе паралельна пачнуцца Дні духоўнай музыкі.

Фота Ілоны КАРПЮК

— Ці Беласток стварае шанс развіцця фестывалю, бо ўмовы тут розныя ад атмасферы камернай Гайнаўкі.

— Нішто не заступіць атмасферы царквы, але якраз Беласток даў магчымасць прэзентаваць нам творы іншых кампазітараў, якіх, я ўпэўнены, немагчыма было б паказаць у Гайнаўцы пры існуючых умовах. Шаную гэтыя ўмовы і рашэнні гаспадароў, але не маю ніякіх сумненняў, што не выканалі б там поўнасцю Тавенера, Твардоўскага, Пэндэрэцкага ці іншых кампазітараў. Я ўпэўнены, што на такую адкрытасць сённяшнія царкоўныя ўлады ў Гайнаўцы не дазволілі б. Тут маем свабоду. Розніца таксама ў публіцы. За дваццаць гадоў мы паспелі выхаваць гайнаўскую публіку, большасць якой сапраўды захапляецца царкоўным спевам, аднак ёсць і такія, што прыходзяць па палітычнай карэктнасці. А ў Беластоку зусім іншыя ўмовы, а затым і публіка. Робім усё, каб сустрэлася яна з самым высокім мастацтвам і духоўнасцю. Зразумела, і з адкрытасцю на розныя культуры, веравызнанні, выканаўцаў і кампазітараў. Сёлета перад усім адкрываемся на маладых, на дзіцячыя і маладзёжныя хары, бо ў іх надзея на будучыню царкоўнай музыкі.

— Беластоцкі фестываль жыве ўжо сваім жыццём. Ці адчуваеце яшчэ жаль за гэтае прымусовае перасяленне?

— Калі астаўся нейкі жаль дык толькі таму, што мяне і маіх супрацоўнікоў звычайна пакрыўдзілі і да гэтага беспадстаўна. Але таго, што пры нагодзе патраціла Гайнўка, немагчыма не заўважыць. Калісь прыязджаў у Гайнаўку ўвесь праваслаўны і свецкі свет, зараз гэтага няма. Варта спытацца толькі: чаму?

— Да якіх мэт увесь час імкнецца Мікалай Бушко?

— Гэтых мэт мноства, але няхай застануцца яны тайнай.

— Раскрыйце хаця б частку.

— Няхай прыкладам будзе Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Расіі імя Юрлова. Каля яе я „хадзіў” многія гады. Іх прыезд сёлета гэта вынік працэсу, але і нейкая метафізіка!

— За два гады чарговы юбілей. Якія мары пры нагодзе будзеце здзяйсняць?

— Калі дажывем, пакажам тое, што найлепшае. Але пакуль трыццаты фестываль, у будучым годзе адзначым яшчэ чарговы юбілей Рамуальда Твардоўскага, будзем прэзентаваць самыя выдатныя творы царкоўнай музыкі гэтага кампазітара, перад усім літургію.

— Вы калісь таксама спявалі ў хоры. Не маеце часам ахвоты выйсці на сцэну?

— *(усмешка)* Ведаеце, самы цудоўны інструмент — людскі голас, а найбліжэйшы яму па эмацыянальнасці — скрыпка. З цягам гадоў скрыпка становіцца больш дасканалым інструментам, а пра чалавека нельга такое сказаць.

— Але бывае, што спяваеце...

— Так, ад душы *(усмешка)*.

— Калі б Вы не прыдумалі фестывалю, чым напоўнена было б Ваша жыццё?

— Калі б на маёй дарозе не з'явілася культура, а сваю энергію аддаў бы бізнесу, я ў матэрыяльным сэнсе напэўна быў бы багатым чалавекам. Зараз з'яўляюся перад усім багатым у духоўным плане.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск Падляшскі • Сяматычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Дзіравы цуд свету ☞ 2

Раіна СТЭФАНЧУК

— Сёлета не хопіць сродкаў на рамонт дарогі Гайнаўка — Белавежа, — прадбачыў у час апошняй сесіі падляшскага самаўрадавага сейміка маршалак Яраслаў Дважанскі. Тым часам гаворка ў першую чаргу аб здабыцці грошай на адрэзак ледзь у два з паловай кіламетра, пра які Падляшская ўправа ваяводскіх дарог (ПУВД) кажа, што ён кепскі (уся тая дарога налічвае больш за дваццаць кіламетраў)...

Засуха ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Пазнаем Беларусь ☞ 8

Міра ЛУКША

Гай святкуе ☞ 10

Ілона КАРПЮК

9 770546 196000

Дзень перамогі

У Беларусі прайшоў чарговы Дзень перамогі. Прайшоў урачыста, у духу савецкага часу, калі дзевятага мая было самым вялікім і самым прапагандаваным святам. Цэлыя пакаленні выраслі на выпрацаванай савецкімі ідэолагамі ваеннай тэматыцы. Пра гэтую вялікую і крывавую вайну вучылі ў школе, пра яе здымалі стужкі, пісалі кнігі, расказвалі па тэлебачанні, і ўсіх, хто нарадзіўся пасля другой сусветнай вайны, называлі шчаслівым пасляваенным пакаленнем. Подзвіг ветэранаў лічыўся не толькі вялікім і бессмяротным, але і важным яшчэ таму, што пасля іх вялікай перамогі савецкі народ ужо ніколі не будзе ваяваць. Бо ўвесь свет пабачыў стойкасць савецкага чалавека і веліч савецкай зброі.

Праўда, пры гэтым чамусьці замоўчвалі знакамітую прамову генералісімуса Сталіна, які падняў пасля вайны тост за рускі народ. Менавіта за рускі. І назваў гэты народ галоўным у суквецці ўсіх народаў, якія засялялі бязмежныя тэрыторыі СССР. І сказаў, што веліч рускага народа якраз у тым, што, нягледзячы на паразы на пачатку вайны, рускі народ працягваў ліць на палях баёў кроў сваіх сыноў, але ні разу не надумаўся змяніць кіраўніцтва савецкай дзяржавы, якое, па сутнасці, і было вінаватае ў гэтых паразах.

Зразумела, што кожнаму пажыццёва абранаму кіраўніку краіны хочацца мець менавіта такі народ, які ні пры якіх абставінах не захоча мяняць сваё кіраўніцтва, які будзе верыць і давяраць ягоным словам. Ужо савецкія войскі знішчалі прагу да волі ў Чэхаславакіі і іншых рэспубліках сацыялістычнага лагера, гінулі ў В'етнаме, ужо была вайна ў Афганістане, адкуль неперапынным патокам прывозілі труны з загінуўшымі юнакамі, учарашнімі школьнікамі, якія зусім нядаўна, атрымаўшы дыплом сярэдняй школы і ўступаючы ў дарослае жыццё, марылі пра тое, якое яно будзе шчаслівае. Хіба можа таму, вярнуўшыся з Афганістана без ног, многія з іх станавіліся ў канец доўгіх савецкіх чэргаў па любы тавар, і не махалі афганскімі пасведчаннямі, каб іх прапусцілі без чаргі. І не хадзілі штодзённа з баявымі ўзнагародамі. Яны ўжо не верылі савецкаму кіраўніцтву, якое наўмысна распаўсюджвала чуткі, што ўсе афганцы крыху з псіхічнымі парушэннямі, таму не трэба верыць іх расказам пра тое, што ў Афганістане вайна. Трэба верыць савецкаму тэлебачанню, якое паказвае савецкіх салдат пры будове ў Кабуле школы для дзяцей, і аніякай стрэляніны там няма.

А тут, у Савецкім Саюзе, нягледзячы на тое, што СССР вёў войны і ліў кроў, працягвалі дзевятага мая святкаваць Дзень перамогі, пасля якога савецкія людзі не мелі ўжо гінуць на войнах.

Праўду сталі гаварыць тады, як СССР разваліўся. Праўду і пра тую вайну з фашызмам, і пра афганскую вайну, і пра ўсе іншыя войны, якія вёў беларускі народ. Праўду і пра тое, як знішчалі беларусаў да вайны, падчас вайны і пасля яе. І пра тое, як многіх герояў вайны пасля перамогі прама з фронту адпраўлялі ў турмы толькі за тое, што яны асмеліліся пахваліць нямецкія дарогі ці задумацца над тым, як немцам удалося дасягнуць такога дабрабыту, якога ў СССР не было ніколі, нягледзячы на дармовую працоўную сілу і безліч невінавата закатаваных і абрабаваных людзей. Праўду і пра тое, што, згубіўшы сваю незалежнасць, беларусы на розных войнах ваявалі па абодва бакі лініі фронту, забіваючы адзін аднаго за чужыя інтарэсы.

Але ўся гэтая праўда хутка скончылася. І зноў засталася толькі адна вайна, і адзін Дзень перамогі. У Беларусі збудаваная міфічная Лінія Сталіна, таго самага Сталіна, які падняў бакал і сказаў тост за рускі народ. Пра беларусаў ён прамаўчаў. Ён не хацеў, каб яны ўвогуле існавалі. Ён хацеў, каб мы ўсе сталі рускімі. Бо рускі народ лье сваю кроў, але кіраўніцтва не мяняе.

Праўду пра вайну зноў перасталі гаварыць менавіта тады, калі зноў сталі нішчыць беларускую мову і беларускую памяць. І ўжо супрацоўнікі сілавых органаў папярэджваюць моладзевых актывістаў, каб не сунуліся на святкаванне Дня перамогі. І пільна сочаць, каб ніхто ў гэты дзень не ўзняў бел-чырвона-белы сцяг і не крыкнуў пераможнае „Жыве Беларусь!".

Віктар САЗОНАЎ

Дзіравы цуд свету

— Сёлета не хопіць сродкаў на рамонт дарогі Гайнаўка — Белавежа, — прадбачыў у час апошняй сесіі падляшскага самаўрадавага сейміка маршалак Яраслаў Дважанскі. Тым часам гаворка ў першую чаргу аб здабыцці грошай на адрэзак ледзь у два з паловай кіламетра, пра які Падляшская ўправа ваяводскіх дарог (ПУВД) кажа, што ён кепскі (уся тая дарога налічвае больш за дваццаць кіламетраў).

За гэтую дарогу заступаўся ў час пасяджэння сейміка радны клуба СЛД Збігнеў Кшывіцкі. Пасля ў размове „Нівай" сказаў ён:

— Гэта не толькі эканамічнае пытанне, але мае яно таксама грамадскі маштаб.

Здзіўляе яго недахоп грошай якраз на гэтую дарогу, асабліва ў кантэксце кампаніі м.інш. Падляшскай маршалкоўскай управы за тое, каб Белавежскай пушчы прыдбаць статус сёмага цуду свету:

— Прыклад з фінансаваннем дарогі Гайнаўка — Белавежа можа сведчыць аб тым, што хутчэй будзе гэта віртуальны цуд.

Пры нагодзе заявы маршалка Дважанскага мы пацікавіліся планамі мадэрнізацыі дарог з Беластока ў Гайнаўку і з Гайнаўкі ў Белавежу. Бэата Ежэрыс з беластоцкай ПУВД прыслала нам абшырныя тлумачэнні. І так даведаліся мы, што тэхнічны стан ваяводскай дарогі на адрэзку Заблудаў — Гайнаўка (каля 50 км, беручы пад увагу праезд праз Гайнаўку) „можна назваць генеральна задавальняючым (62,5% даўжыні адрэзка), што значыць, што насычанасць розных відаў пашкоджанняў (...) вагаецца ў межах ад 26 да 50% цалкавітага палатна маставой. Блізка 30,7% даўжыні гэтага адрэзка гэта маставая ў задавальняючым стане, гэта значыць — добрым або вельмі добрым, а ў стане незадавальняючым застаецца каля 6,8%, з чаго 1,5% патрабуе неадкладнай інтэрвенцыі".

Аказалася, што сёлета за грошы ПУВД на адрэзку дарогі Заблудаў — Гайнаўка будзе перабудавана адно Беластоцкая вуліца ў Гайнаўцы (працы тут працягваюцца з перапынкамі каля дзевяці гадоў). Аб'ём работ ахоплівае адрэзак 200 метраў на вышыні адміністрацыйнай мяжы горада, а прадбачваны кошт гэтага мерапрыемства складае 700 тыс. злотых. Апроч таго яшчэ сёлета ўправа ваяводскіх дарог намерваецца пачаць дарожныя работы на адрэзку Навасады — Гайнаўка, які складае частку інвестыцыйнага праекта фінансаванага з еўрасаюзных фондаў у рамках Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы Падляшскага ваяводства (гаворка аб больш за 6 км), а таксама на адрэзку Звадзецкае — Навасады (нацэлы кіламетр). Перабудова дарогі Заблудаў — Гайнаўка мае быць завершана ў 2012 г. і ацэначна мае каштаваць 33,5 млн. злотых.

Адносна дарогі Белавежа — Гайнаўка, ПУВД акрэсліла яе стан на даўжыні 3,38 км (16,4%) як задавальняючы. Спыталіся мы ў кіраўніка аддзела транспарту і дарог староства ў Гайнаўцы Мікаля Тэлентэюка ці можа якраз павятовыя ўлады бачаць нейкую магчымасць фінансавай падтрымкі рамонту яшчэ ў гэтым годзе:

— Няма ў нас грошай на павятовыя дарогі, не гаворачы ўжо пра ваяводскія. Калі гаворка пра павятовыя дарогі, стараемся неяк з гэтай справай справіцца з гмінамі.

Тым часам у апошні час падляшскі ваявода падпісаў чарговыя дамовы, у гэты раз разам з прадстаўнікамі сакольскіх самаўрадаў на пабудову шасці лакальных дарог у гэтым павеце. Будуць яны рэалізавацца ў рамках Нацыянальнай праграмы перабудовы лакальных дарог (НППЛД) — гмінных і павятовых. На гэтак званым рэйтынгавым спіску заяў пададзеных да фінансавання ў рамках НППЛД (2008-2011 гг.) МУСіА зацвердзіла да перабудовы і мадэрнізацыі м.інш. наступныя павятовыя дарогі: Сельц — Мень — Рудка — Боцькі, Драгле — Багонікі — Малявічы-Ніжнія ды Спічкі — Орля, вул. Міцкевіча ў Кляшчэлях ды Каляёвую, Паркавую і Вашкевіча ў Белавежы, а таксама гмінныя: Дубічы-Асочныя — Хітрая — Гайнаўка, Кухароўка — Рахвалаўка, Рахвалаўка — Заблудаў, адрэзак дарог у Нараўчанскай гміне, вул. Сасновую ў Чаромсе, частку вуліцы Лётчыкаў Леванеўскіх у Саколцы, вул. Новую ў Крынках. Сярод заяў, якія па фармальных прычынах былі адкінуты МУСіА, апынулася выкананне бітумічнага насцілу на дарозе Радзівілаўка — Грабарка.

— У рамках праграмы НППЛД няма магчымасці фінасавання самаўрадавых ваяводскіх дарог, — сказала нам прэс-сакратар падляшскага ваяводы Іаланта Гадэк.

Значыць, як вынікае з усіх сабраных намі інфармацый, дарога ў Белавежскай пушчы Гайнаўка — Белавежа, у сэрцы прымроенага ваяводскімі ўладамі сёмага цуду свету, пакуль застанецца ў дрэнным стане, прынамсі на гэтым кавалачку ледзь у два з паловай кіламетра.

Раіна СТЭФАНЧУК

Вачыма еўрапейца

Прыёмная сям'я?

Вось і здарылася. Еўрасаюз і шасцёрка краін былога СССР (Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова і Украіна) у палове мінулага тыдня заінаўгуравалі на еўрасаюзным саміце ў Празе праграму Усходняга патрнёрства. У апошнюю хвіліну з тэксту дэкларацыі гэтай праграмы ўстаранілі паняцце „інтэграцыя". Еўрасаюзныя краіны, галоўным чынам Нямеччына, апасаліся, што магло б гэта ўсходнееўрапейскай шасцёрцы даць надзею на даволі хуткае згуртаванне з Еўрасаюзам, а такога якраз не будзе. Дык чым у прынцыпе з'яўляецца Усходняе партнёрства, аб якім мы ў „Ніве" пісалі неаднойчы. Некалькі гадзін да саміта ў Празе прабаваў гэта тлумачыць польскім дэпутатам міністр замежных спраў Радаслаў Сікорскі:

— Усходняе партнёрства не з'яўляецца прамесай будучага ўваходу партнёрскіх дзяржаў у Еўрасаюз, паколькі ў цяперашні час няма ў Еўрасаюзе магчымасці дасягнення кансенсусу адносна гэтай тэмы. Выкананне прадпасылак партнёрства давядзе аднак да рэальнага збліжэння гэтых краін з Еўрасаюзам і патэнцыяльна будзе палёгкай у рэалізацыі іх амбіцый звязаных з поўнай інтэграцыяй з ЕС.

На практыцы гэта абазначае, што ў рамках Усходняга партнёрства еўрасаюзныя краіны з супольнай пулькі прызначаць на рэалізацыю праграмы сімвалічныя (у маштабе падтрымкі хаця б краін імкнучыхся да еўрасаюзнай сям'і пры супольнай згодзе) 600 млн. еўра. Гэтыя грошы маюць быць прызначаны таксама на шматбаковае гаспадарчае супрацоўніцтва, між іншым на заснаванне зон свабоднага гандлю. І якраз тут на такое супрацоўніцтва, ці хутчэй падмогу, галоўным чынам разлічвае, напрыклад, Беларусь. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка (канчаткова не паявіўся на пражскім саміце), яшчэ да прыняцця дэкларацыі аб Партнёрстве гаварыў:

— Беларусь найбольш цікавіць прагматычны бок Усходняга партнёрства, значыць, магчымая падтрымка крэдытамі і інвестыцыямі.

Мне здаецца, што надзей „шасцёркі" не ўдасца зрэалізаваць у рамках Усходняга партнёрства (не думаю тут аб візавых палёгках ці аб — як чакаў таго шэф дыпламатыі Украіны Барыс Тарасюк — „яснай перспектыве ўваходу"), але шляхам яшчэ больш дынамічных двухбаковых стасункаў. Таксама ў выпадку Польшчы неабходным з'яўляецца ўжо цяпер запланаванне адпаведных сродкаў у бюджэтах мінімум на найбліжэйшыя два гады. Дарэчы, намаўляў да таго ў Сейме таксама міністр Сікорскі. Цікава, што дэпутаты ў час тае дэбаты больш перажывалі пытанні Грузіі і стаўлення Масквы да Усходняга партнёрства, чым сувязей у гэтым кантэксце з найбліжэйшымі суседзямі Польшчы: Беларуссю і Украінай. У маскоўскім кантэксце ў час сеймавага выступлення шэф МЗС у Варшаве адзначыў:

— Усходняе партнёрства не з'яўляецца таксама спробай стварэння ЕС сферы ўплываў на Усходзе. Яно не накіравана супраць каго-небудзь.

Тыдзень да пражскага саміту ў Польшчы, у Беластоку таксама, адзначалася пятая гадавіна далучэння да ЕС. Пры нагодзе спытаўся я ў падляшскага ваяводы Мацея Жыўны як мог бы ён заахвоціць Беларусь і іншыя ўсходнееўрапейскія краіны да збліжэння з ЕС. Адказаў ён між іншым:

— Перш за ўсё заахвоціў бы іх да таго, каб паглядзелі здымкі нашай краіны, між іншым і нашага рэгіёна, пяцігадовай даўнасці і цяперашнія. Можна на іх убачыць новыя дарожныя і інфраструктурныя інвестыцыі.

Наконт гэтага заахвочвання ўзніклі ў мяне сумненні. Хто ездзіў па дарогах, якія спалучаюць польскія і беларускія гарады ды мястэчкі, ведае, што ў мяне наўме.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Яцвяжская маёўка

Фота і тэкст: Ганны КАНДРАЦЮК

Панарама з Замкавай гары

На Замкавай гары ў Шурпілах, ля дымячага грыля з каўбаскамі, гарлапаніла вясёлая група. Іх мазурская гаворка, базарныя апранахі і дыскапольны рэпертуар (спявалі вельмі папулярную на Сувальшчыне „Żono moja, serce moje”) паказвалі на іх мясцовае паходжанне. Непадалёк мужчынскага круга, проста на майскай траве, храпла жанчынка. Побач валяліся пакамячаныя банкі з-пад піва.

Я часта бываю ў Шурпілах і заўсёды здзіўляе мяне адна паслядоўнасць. Калі не прыйдзі, зімой ці летам, тут заўсёды нехта гарлапаніць. Хочаш ці не, думаеш пра крыжацкія запіскі, у якіх яцвяжскія песні параўноўваюцца да шурпатага крыку драча...

— А каб вы ведалі як многа біжутэрыі нядаўна адкапалі тут археолагі, — кажа Т., працаўнік Сувальскага ландшафтнага запаведніка.

Каб усё было ясна — мы знаходзіліся ў апошняй сталіцы яцвягаў, гарадзішчы вядомым ужо з VII ст., у сэрцы ахоўнай зоны. Аж хацелася падысці і натыкаць няўважных „турыстаў” носам ў пастаўлены тут указальнік з надпісам: *Не палохаць звярыны!* Бо на Замкавай гары хочацца думаць толькі пра аздобы і прыгожасць. Іх нашэптвае азёрналясны краявід, што акаляе гарадзішча. Сіня-зялёныя азёры з выспамі напамінаюць шмарагдава-дыяментавае кальцо з прыхаванымі ў глыбі азёр і ў лясных нетрах аповедамі пра каханне і смерць. (Яцвяжскія легенды ўсе пра каханне, іх дзеі часта адбываюцца на дне азёр, пад вадой. Верылі, што іх душы пасля смерці паселяцца ў птушак, у дрэвы). Ад такой прыгожасці лёгка звар'яцець, кінуцца ў возера, пайсці ў агонь...

Чыста-празрыстае возера Шурпілы

Мы абышлі кругом гарадзішча і крутой сцяжынай спускаліся да азёра Шурпілы з чыста-празрыстай вадой, у якой на дне віднелі зялёна-шэрыя гладкія камяні.

— Jesteście z Warszawy? Z pensjonatu? — зачапілі нас з надзеяй у голасе мясцовыя. Дзядзькі прывялі напаіць коней у азёрцы-вочку, якое тут чамусьці называюць „багно”.

— Nie do końca! — адказалі мы дыпламатычна і згодна з праўдай.

На Сувальшчыне ўсе прыезджыя — „варшавякі”, нават калі ты з Боцькаў. Дастаткова апрануцца ў турыстычныя апранахі, прыдбаць маркавы ровар, такі ж фотаапарат і пытацца ў напатканых пра цану дамоў і зямлі.

Мы не пыталі пра цану зямлі, мы ведалі што апошняя тэма моцна не ў смак нашым субяседнікам. Раней ў іх было за сто гектараў зямлі, якую па кавалку і чуць не дарма распрадалі „варшавякам”. Пасля прадалі дом, панадворак, жывёлу. Сёння іх родны дом — прэстыжны пансіянат „Пад Замкам”. Нашы субяседнікі жывуць сабе ў хляўку са сваёй прагандляванай жывёлай. Праўда, калі дазваляе здароўе, дапамагаюць свайму пану з Варшавы. Бо пераважна няма калі. Ад жалю, дзень у дзень, заліваюць вантробы. Вінаватыя і тыя турысткі з пансіяната, што як матылькі лётаюць перад вачыма і не даюць спакойна дыхаць:

— Patrzysz i tylko myślisz żeby taką zawalić!

У такіх сітуацыях і месцах думаецца пра гвалт на гісторыі яцвягаў. Яцвягі не пакінулі сваіх летапісаў, не запісалі сваёй мовы. Затое пастараліся за іх заваёўнікі і асімілятары, якія не шкадавалі ім найгоршых эпітэтаў. Слова „шурпілы” тлумачыцца імі як „змрочнае” гарадзішча. Іх жыхарам таксама прыпісаныя незвычайныя рысы характару. Паводле хрысціянскіх міфаў, яцвягі адно наязджалі, гвалтавалі, рабавалі, жыўём лупілі са шкуры. Чытаеш іх творы і думаеш: як добра, што вымерлі паганыя...

У канцы красавіка на гарадзішчы закончыліся археалагічныя раскопкі. Яны кідаюць новае святло на гісторыю яцвягаў. Пад знакам запытання апынулася легендарная вайна з крыжаносцамі ў XIII стагоддзі. Паводле легенды, крыжаносцы штурмавалі гару тры гады. Гэтая падзея мела канчаткова даканаць яцвягаў. Але археолагі не знайшлі матэрыяльных доказаў. Самая вялікая барацьба адбылася ў XI стагоддзі, калі з вайной дайшоў сюды Уладзімір Вялікі, той сам, які ахрысціў Русь і стаў праваслаўным святым. Гістарычныя пласты таго часу нашпігаваныя смяротнай зброяй, жахамі. Новыя заваёўнікі нават назву месца перайменавалі на славянскае *„городіско”*...

„Zamiast koniom zróbta nam zdjęcie”

Яцвягі пакінулі гарадзішча па невядомых прычынах. Гэта сталася ў XIII стагоддзі. Яны выйшлі і ўжо не вярнуліся. Не было вайны з крыжаносцамі...

У такіх хвілінах чалавек думае толькі пра эпідэмію, але апошнюю інфармацыю мы пракаментавалі маўчаннем.

Але думка не адпусціла. Калі мы пакідалі Замкавую гару, дарогу перабегла лясная казуля. Звярына не напалохалася відам людзей і шчоўканнем фотаапаратаў. Наадварот, як фотамадэль яна дазволіла сябе зняць ззаду і спераду ды без спеху схавалася ў кустах. Не давяраю прылюднай звярыне. Адразу думаеш пра шаленства або іншую эпідэмію. Менавіта, ад пандэміі свінога грыпу (найперш у СМІ), я хацела схавацца ў дзікім куточку Сувальшчыны. Дарэмна. Усе пансіянаты і гаспадаркі на кіламетр пахлі печанай каўбасой з грыля. Немагчыма было ў цішы і адзіноце прайсці хоць бы сто метраў. Куды не павернеш, усюды „варшаўка” і турысты, сярод якіх найбольш няшчасна вылучаліся тыя свойскай гадоўлі.

Іх ціхая трагедыя чамусьці напамінала мне лёс вымерлых яцвягаў.

Пакіньма дрэнную звычку

Не трэба нікому напамінаць, што гарэлка шкодзіць, асабліва тым, хто сядае за руль. Гэтая дрэнная звычка характэрная не толькі мужчынам. Аматарамі спіртных напояў бываюць і жанчыны. У панядзелак, 4 траўня, у Чаромсе паліцэйскія затрымалі 34-гадовую жанчыну, вадзіцельніцу мотаролера, з дзесяцігадовым дзецюком на заднім сядзенні. Калі праверылі стан цвярозасці кіроўцы, дык выявілася, што ў крыві мае яна каля трох праміляў алкаголю. У той жа вечар у Гайнаўцы паліцэйскія затрымалі 55-гадовую жанчыну ў нецвярозым відзе, якая мела два з паловай праміля алкаголю і ехала на ровары. Абедзве парушальніцы закону ў нядоўгім часе стануць перад судом. Няхай гэтая легкадумнасць дамачак стане перасцярогай для іншых шафёраў на падпітку, якія ствараюць смяротную пагрозу не толькі сабе і сваім блізкім, але і іншым удзельнікам дарожнага руху.

(УС)

Дэмаграфія Нараўчанскай гміны

15 гадоў назад у Нараўчанскай гміне пражывала 5 330 чалавек, у тым ліку 2 705 мужчын і 2 625 жанчын. Для параўнання: у 1980 годзе ў гміне налічвалася 6 579 жыхароў (3 335 мужчын і 3 235 жанчын).

Найбольшымі вёскамі тады былі: Нараўка (783 асобы), Семяноўка (663), Старое Ляўкова (448), Скупава (349) і Новае Ляўкова (301).

Варта прыгадаць, што ў 1980 годзе ў Нараўцы пражывала 857 чалавек, у Семяноўцы — 809 і ў Скупаве — 460. У 1990 годзе пажанілася 30 пар і ў гэтым жа годзе нарадзілася 61 дзіця.

У 1990 і 1991 гадах найбольш папулярнымі імёнамі, якія бацькі давалі сваім нованароджаным дзецям, былі: Кшыштаф, Пётр, Давід, Каміль, Іаанна, Магдаліна і Анна, а ў 1980 годзе — Пётр, Андрэй, Данель, Лукаш, Малгажата і Эмілія.

Зараз — у 2009 годзе — у Нараўчанскай гміне пражывае 4 204 асобы. Як наглядаецца, мужчыны жывуць карацей чымсьці жанчыны. Мужчын ва ўзросце звыш 60-ці гадоў жыве тут 333 асобы, а жанчын 704. Можам палічыць, што на аднаго пенсіянера прыпадае амаль па дзве з паловай пенсіянеркі!

Нараўка

Запрашэнне да конкурсу

Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі запрашае да ўдзелу ў конкурсе пад загалоўкам „Гісторыя і спадчына пасялення Нараўка (1639-2009)". Конкурс звязаны з юбілеем 370-годдзя ўзнікнення мясцовасці Нараўка.

Тэрмін: да 30 мая 2009 года. Працы прымае Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы, вул. Новая, 3 А. Дэталёвую інфармацыю можна атрымаць у дырэктаркі ГАК Анны Стульгіс ды па тэлефоне 085 685 80 34 ад панядзелка да пятніцы ад 10 да 18 гадзіны.

(яц)

Можа быць слабы ўраджай

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Усе мае суразмоўцы згодны, што засуха, якая працягвалася практычна з часу, калі з палёў сышоў снег, пашкодзіць як на яравае, так і на азімае збожжа, можа быць таксама і слабейшы плён бульбы ды агародніны. Аднак найбольш могуць пацярпець гаспадары, у якіх больш яравага збожжа. Ярына вясной патрабуе больш вады, каб узысці і набраць адпаведнага тэмпа росту. Гаспадары заўважылі, што на ўзгорках пачала сохнуць трава, якая толькі што зазелянела і сталі апасацца, што могуць узнікнуць клопаты з нарыхтоўкай адпаведнай колькасці корму каровам. Канешне, сяляне цешацца зараз прайшоўшымі непрацяглымі ападкамі.

Спадар Пётр з Гацькоў чакаў дажджу, каб пасеяць ярыну. Не дачакаўшыся, ажно ў пачатку мая выйшаў абсеяць палетак ярай пшаніцай. Аднак не ведае, ці не патраціць зярнят у перасохлай зямлі

Людзі па-рознаму адчуюць засуху

На пясчаных палетках збожжа намнога слабейшае, чым на якасных землях, дзе яшчэ красуецца прыгожая азімая пшаніца і ўжо жаўцее рапс. На землях горшай якасці нераўнамерна паўзыходзіла слабаватая ярына. На абочыне краёвай дарогі з Беластока ў Бельск-Падляшскі бачу гаспадара, які затрымаў трактар каля воза, каб папоўніць збожжам сеялку. Не дачакаўся ён дажджу, каб высеяць ярыну ў сырую зямлю, што давала б надзею на хуткі яе ўзыход і прыстойны ўраджай, таму ў пачатку мая рашыўся сеяць яравую пшаніцу ў перасохлую зямлю.

— Усюды суха. Найбольш пажаўцела ярына, якая месцамі яшчэ не ўзышла. Калі не будзе дажджу, не ведаю, ці ўзыдзе і мая яравая пшаніца, якую зараз сею, — заявіў спадар Пётр з Гацькоў.

— Ярына ў нас слабая і азімае збожжа слабейшае, чым было ў мінулых гадах, бо на палях суха, — кажа Тамара Марчук з Рыбалаў. — Бульбу мы ўжо пасадзілі, але без дажджу яна не будзе расці.

— Ад часу, калі снег сышоў з палёў, не было ў нас дажджу, — дадае Марыя Мушынская, Тамарына сяброўка.

Гаспадары найбольш апасаюцца за ярыну

На землях лепшай якасці ў Чыжоўскай і Гайнаўскай гмінах бульба таксама будзе патрабаваць дажджу, хаця магло захавацца ў ёй больш сырасці, чым на пясчаных землях побач Рыбалаў.

— На нашых палях пажаўцела ярына. Асабліва відаць гэта на пясчаных участках, якія таксама ёсць і ў нашай вёсцы. Азіміна менш адчула недахоп дажджоў, але таксама пачала бляднець, — кажа Андрэй Ціханюк з Чыжоў. — Калі не будзе большых дажджоў, ураджай яравага збожжа ў сярэднім можа быць меншым нават на 50%. Азіміна таксама будзе слабейшай, чым у мінулых гадах, але зараз цяжка прагназаваць страты на гэтым збожжы.

— Так атрымалася, што ў гэтым годзе мы пасеялі толькі азімае збожжа, якое покі адчула засуху толькі ў невялікай ступені. Калі аднак у бліжэйшым часе не будзе зацяжных дажджоў, з яравым збожжам можа быць катастрофа, а і азіміна таксама пацерпіць, — гаворыць Ян Адамчук з Чыжоў.

— У Збучы месцамі ярына не ўзышла, а ў іншых месцах яна слабенькая. Я пасеяў толькі азіміну, у галоўным азімую пшаніцу і рапс, — гаворыць Яўген Заброцкі са Збуча, які абрабляе землі добрай якасці і абсейвае іх толькі азімінай. Аднак і ён перажывае за працяглую засуху, бо ведае, што пазней яна кране і азіміну.

Адзін з гаспадароў стаў пацяшаць сябе, што пры паніжаным плёне збожжа можа рэзка павысіцца яго цана. Аднак аб цане збожжа вырашаюць не толькі мясцовыя ці краёвыя вытворцы або пакупнікі, паколькі залежыць яна перш за ўсё ад ураджаю ва ўсім Еўрасаюзе. Калі раней на Беласточчыне, па-за невялікімі эпізодамі, практычна не падаў дождж, дык на захадзе і на поўдні нашай краіны прайшлі шчадраватыя дажджы. Калі на большасці тэрыторыі Еўрасаюза будзе добры ўраджай, цана збожжа можа быць нават меншай, чым у мінулым годзе.

Свой след пакінулі таксама начныя прымаразкі, якія пракаціліся па ўсёй Польшчы. Найбольш пацярпелі трускалкі і сады, бо з-за высокай тэмпературы вегетацыя заўважальна была паскораная. На Гайнаўшчыне прымаразкі паявіліся над зямлёй раней і ў галоўным мелі адмоўнае ўздзеянне на збожжа.

— У нас раней прымёрз і пажаўцеў авёс, але хіба ўжо адпіўся ад прымаразку, бо пачаў зелянець. Аднак будзе патрабаваць дажджу, каб надалей расці, — пачуў я ад гаспадыні з Кляшчэлеўскай гміны.

— У мяне крыху прымёрз рапс, бо яго выгляд зараз іншы, чым павінен быць і таму плён ад яго можа быць ніжэйшым, — кажа Яўген Заброцкі са Збуча.

Летнія засухі больш заўважальныя для гараджан. Я ў час канікулаў сустракаўся з выпадкамі, калі праваслаўныя святары разам з вернікамі маліліся ў Гайнаўцы за дождж і пасля ў даволі хуткім часе падалі дажджы. Дыктар, прэзентуючы нядаўна па радыё прагноз надвор'я, гаварыў, што зараз асталецца маліцца Богу. Можа гаспадары папросяць сваіх святароў, каб супольна памаліцца дзеля спынення веснавой засухі. Хаця апошнім часам вецер на Беласточчыне памяняў свой накірунак з паўночна-ўсходняга на заходні і прайшлі велікаватыя, але кароткія дажды, мала іх, каб спыніць адмоўныя паслядоўнасці засухі. Згодна з прагнозам надвор'я, пасля гэтых дажджоў над Польшчу павінен ужо з захаду надцягнуць атлантычны антыцыклон, які павінен прынесці сонечнае надвор'е. Нават спецыялісты лічаць, што без абложных дажджоў у бліжэйшым часе нельга ўжо будзе спыніць сур'ёзных адмоўных змен у расліннай вытворчасці. Аднак і ў гэтым выпадку многа будзе залежаць ад таго, якой якасці зямлю людзі абрабляюць і ці пасеялі азімае збожжа, якое напэўна менш пацерпіць ад засухі, ці ярыну, што можа месцамі нават амаль поўнасцю засохнуць. Меншым можа быць плён бульбы, ці агародніны, хаця ў апошнім выпадку больш вырашальнымі будуць пазнейшыя дажджы, патрэбныя для вегетацыі пасля ўзыходу.

Загарэлася Белавежская пушча

У час засухі сталі ўспыхаць пажары ў лясах. У многіх рэгіёнах Польшчы штораз часцей лясныя службы забараняюць турыстам уваходу ў лес. У Падляшскім ваяводстве такой забароны покі не ўвялі. Аднак раніцай сырасць подсцілкі ў Белавежскай пушчы акрэслівалася апошнім часам нават на 12% і таму леснікі заклікалі турыстаў асцярожна паводзіць сябе як у нацыянальным парку, так і ва ўсёй пушчы. Аднак не абышлося без пажару. 28 красавіка ў Белавежскім нацыянальным парку непадалёк ад вёскі Грушкі загарэўся лес. Пажар знішчыў каля 9 гектараў ялінавасновага пушчанскага комплексу. Знішчэнні ў час даволі ветранога надвор'я маглі б быць намнога большымі, калі б агонь з ніжніх партый лесу перанёсся на верхавіны дрэў. Тады агонь разам з ветрам мог бы намнога хутчэй распаўсюджвацца і пажарнікам складаней было б яго тушыць.

Гуляка запрасіў кіраўнікоў беларускіх дыяспар у Мінск

Сяргей БУДКІН
Радыё Рацыя, Мінск
www.racyja.com

Прадстаўнікі арганізацый беларускага замежжа і нацыянальных супольнасцей з Беларусі сабраліся разам, каб падзякаваць за працу Апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Менавіта так выглядаў круглы стол на тэму дыялогу дыяспар, што прайшоў 7 траўня ў Мінску. Сярод пытанняў, што былі агучаны на пасяджэнні — стварэнне пры Упаўнаважаным савета, куды ўвойдуць прадстаўнікі беларускіх дыяспар за мяжой, і правядзенне з'езду беларусаў замежжа.

На круглы стол, што праводзіў Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыяльнасцей, сабраліся кіраўнікі беларускіх арганізацый з суседніх краін ды аб'яднанняў нацыянальных меншасцей з Беларусі. Усе спрэс дзякавалі чыноўнікам за падтрымку.

— Мы ўдзячныя ўпаўнаважанаму за падтрымку і рэальную дапамогу, — сказаў Георгі Егіазаран з Мінскага гарадскога армянскага культурна-асветніцкага таварыства.

— Грамадская арганізацыя ў Польшчы не была б магчыма ў такім аб'ёме і з такім поспехамі, каб не дапамога беларускай дзяржавы, — адзначыў Базыль Сегень з Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку.

Старшыня Саюза беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова наогул заявіла, што ўсе беларусы Латвіі цалкам падзяляюць палітыку беларускага прэзідэнта:

— Мы ўсе адзіныя ў сваіх пачуццях да Радзімы, у сваіх адносінах да палітыкі прэзідэнта і ўрада. Тых, хто мае іншыя погляды, у Латвіі не бачна і не чутна.

Такую ўрачыстую хаду мерапрыемства хіба крыху парушыў прафесар Адам Мальдзіс — адзін з лаўрэатаў дзяржаўнага конкурсу на лепшае асвятленне пытанняў міжнацыянальных адносін. Пры ўручэнні дыплома навуковец сказаў упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леаніду Гуляку, што „Голас Радзімы" да дыяспары не даходзіць. Пасля ўручэння прафесар Мальдзіс патлумачыў, што ён меў на ўвазе:

— Я сказаў, што ўсё добра, але голас радзімы не даходзіць да дыяспары. Трэба, каб мы працавалі не ўпустую, а сапраўды мелі гэты кантакт з дыяспарай. Гэта вельмі дрэнна, што ўсё асядае на Захадзе і на Усходзе ў міністэрствах ці пасольствах і далей не ідзе.

Кіраўнік мінскага аддзялення праўладнага Саюза палякаў Беларусі Мечыслаў Лысы падзяліўся бядою сваёй арганізацыі:

— Хацелася б сёння мець большую падтрымку з польскага боку. Шчыра кажучы, актыўнасць з таго боку зменшылася і няма таго, што павінна было б быць. Дзякуй, што беларускія ўлады падтрымліваюць усе нашы пачынанні, усе нашы мерапрыемствы.

Мечыслаў Лысы не марна дзякуе беларускім уладам. Якраз на гэтым пасяджэнні ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леанід Гуляка паведаміў пра стварэнне міжэтнічнага савета, куды ўвайшлі абраныя кіраўнікі арганізацый нацыянальных меншасцей.

Адна з функцый гэтага савета — размеркаванне сродкаў, што выдзяляе дзяржава, на падтрымку нацыянальных меншасцей. Яго ачольвае старшыня Мінскага гарадскога армянскага культурна-асветніцкага таварыства Георгі Егіазаран.

— Праца савета ў цэлым інтэнсіўная і плённая, дзякуючы таму, што нам з боку Упаўнаважанагага па справах рэлігій і нацыянальнасцей аказваецца метадычная, маральная і матэрыяльная падтрымка, — сказаў ён.

Леанід Гуляка паведаміў, што цягам месяца можа паўстаць і яшчэ адзін савет пры Упаўнаважаным па справах рэгігій і нацыянальнасцей. Мяркуецца, што ў яго ўвойдуць прадстаўнікі беларускіх дыяспар за мяжой. Праўда, пры адной галоўнай умове.

— Мы не маем сродкаў, каб запрасіць людзей у Мінск, — сказаў Леанід Гуляка. — Мы ствараем савет, каб запрасіць актыўных людзей, якія ствараюць дыяспары. Каб яны здолелі самі сябе падтрымаць у фінансавым плане ў гэты прыезд.

Таксама на круглым стале была агучана прапанова зладзіць з'езд беларусаў замежжа, якую Леанід Гуляка прыняў да ведама. Варта нагадаць, што сёлета на ліпень запланаваны пяты па ліку з'езд беларусаў свету, што ладзіць міжнароднае грамадскае аб'яднанне Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына". На яго правядзенне ўсе ўстановы сталіцы адмовіліся выдзяляць памяшканне.

Падманлівы твар улады

У рамках „гэтак званай лібералізацыі і адкрыцця" на Еўропу, беларускія ўлады мэтанакіравана прыступілі да знішчэння Міжнароднага грамадскага аб'яднання „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»" і маючага адбыцца ў Мінску 18-19 ліпеня V З'езду беларусаў свету. Як бачым з артыкула журналіста Радыё „Рацыя", міністр Гуляка разгуляўся па поўнай праграме, стараючыся канчаткова разбіць і падзяліць беларускае замежжа. Неяк так дзіўна склалася, што ў гэтым жа часе арганізацыйнаму камітэту „Бацькаўшчыны" паўсюдна адмаўляюць у арэндзе залы ў Мінску. Гэта не выпадковасць, толькі заканамернасць. Проста ўладам недаспадобы тыя беларусы дыяспары і меншасці, што хочуць свабоднай і дэмакратычнай Беларусі. Арганізатарам можна адмовіць у арэндзе залы, удзельнікам з'езду ў візах. І гэта ўсё. Але, такім чынам улада паказвае свой падманлівы твар. А гэтага вобразу не зменяць нат найлепшыя дыпламаты прысланыя з мэтай „папрацаваць" з намі ў замежжы. Іхнія прыгожыя словы пра пашану для беларускасці будуць пустаслоўнымі, а яны самі, як прадстаўнікі і інструмент пануючай улады, пакажуцца гратэскнымі асобамі. Без віз таксама пражывем — мы ўжо да гэтага прывыклі. А з'езд можа адбыцца і па-за межамі Беларусі. І тады кожны зразумее, што такім чынам маем у нашай любімай духоўнай Бацькаўшчыне антыбеларускую ўладу.

Яўген ВАПА

Мінск баіцца беларусаў замежжа?

Палац мастацтваў адмовіў у памяшканні для правядзення Пятага з'езда беларусаў свету. Гэта ўжо васемнаццатая адмова ў сталіцы.

7 мая Рэспубліканская мастацкая галерэя (вул. Казлова, 3), што належыць Беларускаму саюзу мастакоў, адмовіла Згуртаванню беларусаў свету „Бацькаўшчына" ў прадстаўленні памяшкання для правядзення Пятага з'езда беларусаў свету.

У афіцыйным лісце, падпісаным дырэктарам прадпрыемства А. Зінкевічам, гаворыцца, што магчымасці прадставіць памяшканне ў арэнду няма „ў сувязі з дзеяннем раней заключаных дамоў арэнды".

Кіраўніцтва МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»" зазначае, што першапачаткова варыянт правядзення з'езда ў Палацы мастацтваў не разглядаўся, паколькі там невялікае памяшканне. Аднак пасля таго, як астатнія залы горада Мінска адмовілі ў арэндзе, вырашана было даслаць заяўку ў Палац мастацтваў, асабліва ўлічваючы той факт, што гэтая зала належыць Беларускаму саюзу мастакоў і там праводзіліся пасяджэнні ТБМ ды іншыя імпрэзы беларускіх грамадскіх аб'яднанняў.

Раней у прадстаўленні памяшкання адмовілі Палац Рэспублікі, Палац прафсаюзаў, ДК МТЗ, ДК МАЗ, актавая зала Лінгвістычнага ўніверсітэта, Дом афіцэраў і інш.

Пяты з'езд беларусаў свету МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»" запланаваны на 18-19 ліпеня 2009 г. Удзел у ім павінны ўзяць 400 дэлегатаў з больш чым 20 краін.

Ранейшыя чатыры з'езды, якія праводзяцца раз на чатыры гады, праводзіліся ў Мінску.

Кіраўніцтва Згуртавання не выключае, што, калі не ўдасца знайсці памяшканне ў Мінску, галоўны форум беларускай дыяспары будзе праведзены па-за межамі Беларусі.

Прэс-служба МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»"

Басейн у кастрычніку?

У цэнтры Гайнаўкі будуюць крыты басейн для плавання. Будынак мае арыгінальную сучасную архітэктуру. У ім шмат вялікіх акон.

У аб'екце — два басейны: для дарослых і для дзяцей ды вежа для з'язджання. Ля будынка будуць стаянкі для аўтамашын. Здадуць яго ў карыстанне — паводле меркаванняў бурмістра Анатоля Ахрыцюка — у кастрычніку гэтага года (дагавор на 15 снежня 2009 года). Кошт пабудовы басейна і аўтастаянкі склаў суму 19 млн. 600 тыс. зл. **(яц)**

За выгаду заплацім

З пачаткам мая Банк ПКО С.А. павышае цэны некаторых паслуг. Для прыкладу: за месячнае абслугоўванне рахунка будзем плаціць 6,90 зл., а не 5,40 зл. як дагэтуль. На злот павышаецца цана банкавага перавода (на рахунак у другім банку), г.зн. з 4 на 5 зл. Па даўнейшаму застаюцца аплаты за рэалізацыю пастаянных даручэнняў — 1,50 зл. І тое прынамсі цешыць. Як бачым, фінансавы крызіс кранае не толькі грамадзян, але і банкі. Павышэнне цэн банкіры абгрунтоўваюць ростам коштаў абслугоўвання кліентаў. Прымаўка кажа: „Хочаш карыстацца выгадай, тады плаці". **(ус)**

БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАЛОГІЯ Ў БЕЛАСТОКУ ЗАПРАШАЕ

Не прапусціце магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю ў нас.

Беларуская філалогія — адкрыты шлях у свет.

Студыяванне на гэтым напрамку прызначана для асоб, якія хацелі б на вышэйшым узроўні вывучыць беларускую мову, літаратуру, грунтоўна пазнаёміцца з культурай і гісторыяй гэтага моўнага абшару. Прымаюцца кандыдаты, якія ведаюць беларускую мову, а таксама тыя, хто яе не вывучаў. Праграмай прадугледжана таксама вывучэнне яшчэ дзвюх моў — англійскай і рускай і поўнае авалоданне камп'ютэрнай тэхнікай. Нашы студэнты карыстаюцца правам паралельнай вучобы на іншых кірунках.

Выпускніка беларускай філалогіі чакае найперш беларускае асяроддзе ў Польшчы: школьніцтва, радыёвяшчанне, тэлебачанне, выдавецтвы, няўрадавыя арганізацыі. Таксама патрабуюцца спецыялісты з веданнем беларускай мовы, культуры, беларускіх рэаліяў для міждзяржаўнага супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю (камерцыя, культура, палітыка, самаўрадавая дзейнасць).

Кандыдаты маюць да выбару дзве спецыяльнасці:

— Беларуская філалогія

— Беларуская філалогія з англійскай моваю

Усе праблемныя пытанні ў справе рэкрутацыі на беларускую філалогію можна вырашыць, звярнуўшыся непасрэдна да сакратара прыёмнай камісіі, супрацоўніцы кафедры беларускай філалогіі мгр Аліны Філіновіч: **502-577-062**

Наш адрас:
Instytut Filologii Wschodniosłowiańskiej, 15-420 Białystok,
ul. Plac Uniwersytecki 1
Tel. 085—745—74—50

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Танцавала рыба з ракам!

Гжэсь Кобус дэкламуе верш, а яго падтрымлівае (за ручку) Мацек Плуг

Аня Фіёнік складае карагод

— *Добрэ діэткі!* — вітаецца Анна Фіёнік. — *Трэба нам покрычаці. Давайтэ поклічэм Пецю, коб вун вывёў нас з вэлікого ліэса... Добрэ?*

— Таааааак! — заяўляюць хорам малечы. І разам гукаюць таго Пецю. Спачатку маркотна, ціхавата: — *Эй Пеця...*

— *Думаетэ што вун нас почув?* — пераконвае малых інструктарка. — *Давайтэ поклічэм шчэ раз, голосніэй.* — Пасля чарговых заўваг, хорык мацуецца: — *Эй Пеці-а-а-а!!!* — грыміць у канцы дзіцячы калектыў.

— *Добрэ!* — спыняе жэстам малых настаўніца. Так выглядае „расспеўванне". За момант будуць спяваць і танчыць на знаёмы ўжо верш пра зайца: (*Бегаў зайчык по капусці, носіў ляльку в жовтуой хустцы...*). Адразу фармуюцца два колы: звонку дзяўчаткі Віка, Юля, дзве Дар'і, усярэдзіне — хлопчыкі: Грыша, Каміль, Мацек, Дамян.

Гульня выклікае многа энергіі, смеху. Нам, дарослым, таксама прыемна глядзець, што песні і гульні на сваёй мове падабаюцца малым. Яны любяць яе несвядома (у дамах пераважна гавораць папольску!). Мы ў прадшколлі № 7 у Бельску-Падляшскім. Ад шасці гадоў вядуцца тут заняткі па рэгіянальнай адукацыі. На заняткі гуртка, які вядуць спадарыні Іаанна Юзючук і Тэрэза Артэмюк прыходзіць сорак дзяцей.

Гэта прыблізна чацвёртая частка ўсіх дзяцей нашага садка, — кажа дырэктар Малгажата Куна. — Дзеці тут пазнаюць беларускую культуру Бельшчыны. Яна ім знаёмая і блізкая. Таму такое вялікае зацікаўленне.

З першага сакавіка г.г. у прадшколлі дадаткова вядзецца праект „Беларускія песні і гульні, курсы аўтэнтычнага беларускага фальклору". Заняткі вядзе Аня Фіёнік ад „Жэмэрвы". Праект напісаў і здабыў сродкі Звяз беларускай моладзі. Гэта выключная сітуацыя. Амаль усе нашы арганізацыі здабываюць гранты для сябе саміх:

— Гэта наш першы адукацыйны праект, прысвечаны малым дзеткам, — адзначае Ігар Лукашук, дзеяч ЗБМ і настаўнік з Аўгустова. — Мы, як арганізацыя, хацелі б падмацаваць беларускі гурток, які вядуць тут спадарыні Іаанна і Тэрэза.

Амаль усе ўдзельнікі беларускага гуртка пойдуць пасля ў беларускую „тройку". Там будуць працягваць вучыцца беларускай мове, займацца ў мастацкіх гуртках, спяваць у малой „Жэмэрве" і вывучаць старыя песні Бельшчыны.

Я карыстаюся кніжкай „Як выскочыв воробіэй", — кажа Анна Фіёнік, — там адпаведная падборка лічылак і песень, запісаных у нашых вёсках. Тэкст спалучаю з рухам і гульнёй. Крокі для танцаў падбіраю сама. Гэта ў асноўным элементы карагодаў. Як і сёння, тэмай заняткаў было развучванне лічылкі з Галадоў: *Таньцовала рыба з раком, раз-два-тры! раз-два-тры! А пэтрушка з пастэрнаком, раз-два-тры! Раз-два-тры!..* (два крокі ўправа, два ўлева, у час калі ідуць лічбы, дзеткі пляскаюць у далоні, на канец фразы адбіваюць далоні з сябрамі).

— А ведаеце што такое той „пастэрнак"? — пытаю малых.

— Неее! — заяўляюць хорыкам дашкольнікі.

— Менавіта, — прапануе Аня Фіёнік, — гэта будзе ваша дамашняя праца. Вы спытайце сваіх бацькоў што гэта за такая гародніна „пастэрнак"?! А я раскажу вам казку пра сынка Васілька і ведзьму. Здаецца, пані Аня напалохала нашых сяброў казкай пра страшную ведзьму і яе сябровак. Яе слухалі з прыадкрытымі роцікамі. А пасля, замест каментарыя, адазвалася Дарка Прахарук:

— Я таксама ведаю казку!

— А скажаш нам?

Дзяўчынка крышку памялася, каб у канцы, на радасць і смех прысутным, павольна і разборліва прадэкламаваць:

Антон бородаты
Гнаў козу коло хаты.
Антоніха помагала,
Кіём козу поганяла!

Калі дзеткі дэкламавалі вершы і спявалі песенькі, мы пляскалі ім і хвалілі. Файна, калі дзеткі і дарослыя размаўляюць пасвойму, значыць, натуральна. Нашы сябры неўзабаве выступяць на фальклорным фестывалі „Там по маёвуй росі". І яшчэ адна цікавінка: дзякуючы праекту старэйшых сяброў з ЗБМ, будуць яны мець народныя строі. Іх пашыюць і вышыюць бельскія рукадзельніцы.

Танцавала рыба з ракам

Іаанна Юзючук, Ігар Лукашук, Тэрэза Артэмюк

Фота і тэкст: ЗОРКА

Зося з першага „а” класа

— 30 —

Калі трэцякласнікі пісалі экзамен на атэстат сталасці, малодшыя ліцэісты карысталіся свабодай. Зося падумала з'ездзіць у вёску Свідруны. Там яна праводзіла летнія канікулы ў свае дзіцячыя гады. На месцы сустрэлася з Маяй Грыгарук, якой якраз споўнілася васемнаццаць гадоў.

— Давай, сходзім на вясковую забаву, — прапанавала сяброўка. — Трэба адзначыць нагоду, патанчыць...

— З прыемнасцю, — пагадзілася Зося, — нельга прапусціць такі важны момант у жыцці як дарослась!

Па дарозе дзяўчаты мінулі летні дом самага вядомага палітыка ў дзяржаве.

— На жаль, сёння мы яго не сустрэнем, — сказала Мая, — бо вядзе выбарчую кампанію ў сталіцы. Ён выступаў у тэлебачанні пераапрануты за Леніна і дражніўся са спадаром прэзідэнтам.

— Цікавы спосаб на папулярнасць, — пракаментавала Зося.

— Мне падабаюцца яго двухсэнсоўныя жарты, — заявіла Мая, — таму прагаласую за яго ў надыходзячых выбарах.

На вясковую забаву звалілася процьма дзяўчат і хлапцоў. Спачатку Зося дрэнна сябе адчувала пры музыцы дыска-пола. І яшчэ даведалася ад Маі, што яе хоча збіць „каралева забавы”.

— Ці можаш паўтарыць яе прозвішча, — папрасіла Зося.

— Еўка Якімюк! Ты яе ведаеш?

— Здаецца, так. Мы сябравалі ў дзіцячыя гады. Дзіўная справа, яна мяне не памятае?

Зося сама падышла да Евы, каб вырашыць пытанне бойкі. „Каралева забавы” пачырванела ад сораму і выйшла на двор.

— Добра, што ты прагнала гэтую ведзьму! — сказаў адзін хлапец. — Цяпер ты сама можаш стаць „каралевай забавы”! Затанчым?

Зося пайшла ў скокі і ўжо не перашкаджала ёй безгустоўная музыка. І час зляцеў як адна хвіліна.

Калі пасля танцаў дзяўчаты вярталіся дахаты, іх абагнала вялікая машына. За рулём сядзеў вядомы палтітык, яшчэ ў шапцы Леніна на галаве. Ён не спыніўся і не падвёз стомленых танцорак. Таму Мая адразу памяняла палітычныя погляды. Яна рашыла, што на будучых выбарах прагаласуе за саперніка вядомага палітыка.

Тэкст: wodorotlenek92@w.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Пахне „Чарамшынай”

Ужо амаль шаснаццаць гадоў водар „Чарамшыны” разыходзіцца па ўсім Падляшшы. Вядома, што не пра куст ці дрэва гаворка, а толькі пра чаромхаўскі гурт, які, нібыта вецер, проста рассявае пах фольку. Пачаткі гурту прадвяшчалі яму вялікі поспех, бо месяц пасля яго заснавання музыкі падаліся ўжо ў Люблін на славутыя „Фолькавыя Мікалайкі”. Тры гады працавалі яны на сваю першую аўдыёкасету, якая ў 1996 г. з'явілася пад назвай „Чом ты нэ прышов”. Два гады пазней слухачам прэзентаваўся ўжо чарговы запіс „Крыніца”, а прытым расла папулярнасць гурту. Шчыра кажучы, Польшча ды свет падляшскі фольк пазналі ў вялікай ступені дзякуючы „Чарамшыне”, якая большасць сваіх песень выконвае на мясцовай гаворцы. Гурт свайго часу, як адзін з нешматлікіх прапагандыстаў лакальнай культуры жыхароў Падляшша, пачаў прэзентавацца на тэлебачанні. Вандраваў па тэлеканалах са сваёй творчасцю і заахвочваў слухаць музыку ды наведваць Падляшша, асабліва Чаромху, адкуль і сам гурт, і ў якой прайшло ўжо трынаццаць выпускаў фестывалю „З вясковага панадворка”. „Чарамшына” прыдумала ідэю гэтага фестывалю і, безумоўна, з'яўляецца гаспадаром мерапрыемства.

Апрача соцень канцэртаў гурт знайшоў час на цікавыя праекты, між іншым з выдатным беларускім вакалістам і мультыінструменталістам Тодарам. Такім чынам з'явілася праграма, выкананая ў час канцэрта „Для Пушчы і людзей”, прысвечанага Белавежскай пушчы. У тым часе з'явіліся яшчэ два выданні, а менавіта „...” у 2000 г. ды „Гуляй пакуль час” у 2003 г., якія інтэрнаўты ўзнагародзілі „Віртуальнымі гуслямі” за лепшы альбом 2003 г.

Хаця „Чарамшына” вядомая ва ўсім свеце і ўвесь час шукае сабе вышэйшых мэт ды выклікаў, не забывае пра лакальных слухачоў, таму можна яе сустрэць на канцэртах ці то ў Нараўцы, ці ў Беластоку, ці ў Дубічах-Царкоўных. А зусім нядаўна абдаравала меламанаў чарговым альбомам, які ўсміхаецца да нас з-за драўляных аканіц.

i_basovka@o2.pl

Міра ЛУКША

Муха з Махнатага

Бзыніць Мішку муха
у правае вуха:
„Мішка мушак не любіць,
і што зловіць, дык згубіць!”
У правым вуху Мішка чуе,
як муха наракае і талкуе,
бы свідруе напралёт,
або як верталёт
Мішку ў вушку так гудзе!
Не схаваешся нідзе!
Не ўцячэш ты нікуды
ад мушынае бяды!
Бо хоць можа спраўна, лоўка
ўцякаць, ды мухалоўка
змусіць кончыць лёс мушыны.
Засталіся б успаміны!..
Ці ж напіша хто пра мушку
верш які, пра сакатушку,
бзыканне хто ўвекавечыць,
злічыць усе слядкі на печы,
радаслоўную мушыну
хто ўшануе ўспамінам?..
Мішка, сядзь, мухі не пляж!
Напішы лепш рэпартаж!

Польска-беларуская крыжаванка № 20

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 16:

След, пуп, малы, вясёлка, час, гліна, яр. Круг, луг, Лі, мяч, пасада, лёс, пыл, справа.

Узнагароды, кніжку Віктара Шведа „Смяшынкі”, выйгралі **Дагмара Крук** з Дубін, **Яраслаў Нічыпарук** і **Магда Свентахоўская** з Новага Корніна. Віншуем!



XXVIII Międzynarodowy Festiwal Muzyki Cerkiewnej 2009

PROGRAM FESTIWALU

Opera i Filharmonia Podlaska w Białymstoku, ul. Podleśna 2

INAUGURACJA FESTIWALU

20.05.2009 (środa), godz. 18.00

Otwarcie Festiwalu

Chór Politechniki Białostockiej pod dyr. Violetty Miłkowskiej

Chór Filharmonii w Charkowie (Ukraina) pod dyr. Andrija Sirotienko

Koncert Inauguracyjny

Łesia Diczko „Liturgia Uroczysta" *wykonuje:* **Chór Filharmonii w Charkowie (Ukraina)**

Konstanty Gorski „Zriaszcze mia biezgłasna" *wykonują:* **Chór Politechniki Białostockiej (Polska), Chór Państwowego Uniwersytetu Lingwistycznego w Mińsku (Białoruś), Chór Konserwatorium w St. Petersburgu (Rosja), Chór Filharmonii w Charkowie (Ukraina)**

Chórami dyryguje: Andrij Sirotienko

PRZESŁUCHANIA KONKURSOWE

21.05.2009 (czwartek) godz. 17.00

1. *Chór Staroobrzędowców „Rusalia"* — Kolkia (Estonia)
2. *Chór Mieszany* — Visaginas (Litwa)
3. *Chór Mieszany „Bogorodiczen"* — Bugulma (Rosja)
4. *Chór Kościoła Chrześcijan Baptystów* — Białystok (Polska)
5. *Chór „Cantata" Elbląskiej Uczelni Humanistyczno-Ekonomicznej* — Elbląg (Polska)
6. *Chór Wyższej Szkoły Administracji Publicznej* — Białystok (Polska)
7. *Chór „Cantus Juventae" Państwowego Uniwersytetu Lingwistycznego* — Mińsk (Białoruś)

22.05.2009 (piątek) godz. 15.00

1. *Chór „Melodia" Szkoły Muzycznej im. Hofmana* — Kaliningrad (Rosja)
2. *Wzorcowy Chór Chłopięcy Szkoły Artystycznej* — Swietłogorsk (Białoruś)
3. *Chór „Wohnyk" Pałacu Dzieci i Młodzieży* — Kijów (Ukraina)
4. *Chór Mieszany* — Berlin (Niemcy)
5. *Kameralny Chór „Renesans"* — Jużnoukraińsk (Ukraina)
6. *Chór „Lira" Państwowego Uniwersytetu Mołdawii* — Kiszyniów (Mołdawia)
7. *Chór Mieszany „Educatus" Uniwersytetu Pedagogicznego* — Kraków (Polska)

23.05.2009 (sobota) godz. 15.00

1. *Chór „Primavera"* — Gura Humorului (Rumunia)
2. *Chór Mieszany* — Vranov (Słowacja)
3. *Chór Państwowego Konserwatorium* — Rostów (Rosja)
4. *Chór Uczelni Artystycznej „Schola Cantorum Budapestiensis"* — Budapeszt (Węgry)
5. *Chór „Jarosławna" Uczelni Muzycznej* — Kijów (Ukraina)
6. *Chór Sankt Petersburskiego Konserwatorium* — Sankt Petersburg (Rosja)
7. *Państwowy Chór Kameralny „Polifonia"* — Szaulaj (Litwa)
8. *Państwowy Chór Kameralny Wojsk Lądowych Ukrainy* — Czernihów (Ukraina)
9. *Państwowa Akademicka Kapełła Chóralna Rosji im. A. Jurłowa* — Moskwa (Rosja)

ZAKOŃCZENIE FESTIWALU

24.05.2009 (niedziela)

godz. 14.30 — **Ogłoszenie werdyktu Jury i wręczenie nagród**

godz. 16.00 — **Koncert Galowy**

„Пазнаем Беларусь"

На сцэне — пераможцы

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Конкурс „Пазнай Беларусь" быў аб'яўлены Культурны цэнтрам Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча ў першы раз на пачатку 2009 года для моладзі, пражываючай у Польшчы, зацікаўленай гісторыяй і культурай Беларусі, яе сучасным жыццём. Мэтай конкурсу была папулярызацыя сярод маладога пакалення беларусаў у Польшчы ведаў пра культуру, гісторыю і сучаснасць Беларусі, садзейнічанне рэалізацыі творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі беларускай меншасці ў Польшчы, зацікаўленне грамадскасці праблемай захавання нацыянальнай самасвядомасці сярод беларускай моладзі ў Польшчы. У конкурсе прынялі ўдзел вучні навучальных устаноў у Польшчы ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў, не толькі вывучаючыя беларускую мову. Да ўдзелу ў конкурсе прыняты былі не толькі працы на беларускай мове 3 па польску. Адзначалася арыгінальнасць і творчы падыход да афармлення.

Намінацыі конкурсу мелі тры ўзроставыя катэгорыі: ад 3 да 6 гадоў, ад 7 да 12 гадоў, ад 13 да 18 гадоў. Па кожнай намінацыі вызначаны былі пераможцы па ўзроставых катэгорыях з прысуджэннем дыпломаў першай, другой і трэцяй ступені. Конкурс праводзіўся па намінацыях: лепшы малюнак пра Беларусь, фотаздымак аб Беларусі, літаратурна-паэтычны твор (апавяданні, вершы, замалёўкі і г.д.), сачыненне „Беларусь у гісторыі маёй сям'і" і распрацоўка сімвала конкурсу „Пазнай Беларусь". Працы прымаліся да 15 красавіка г.г. На конкурс паступіла 112 прац. Прыйшлі нават цікавыя сачыненні ад моладзі з Беларусі, якія аб конкурсе даведаліся з „Нівы".

Кожны ўдзельнік конкурсу адзначаны быў ганаровым дыпломам, а пераможцы конкурсу ўзнагароджаны каштоўнымі прызамі. Падвядзенне вынікаў конкурсу адбылося ў будынку Беластоцкай філармоніі і оперы, з запрашэннем СМІ, прадстаўнікоў Пасольства, беларускай грамадскасці і гасцей з Беларусі. Для ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсу падрыхтавана была канцэртная праграма з запрашэннем мастацкіх калектываў з Гродна і з удзелам творчых дзіцячых калектываў беларускай меншасці ў Польшчы. Канцэрт 5 мая паказваўся на фоне экспазіцыі з лепшых работ удзельнікаў конкурсу.

У намінацыі на лагатып конкурсу „Пазнай Беларусь" перамог праект Ганны Рубашэўскай з Агульнаадукацыйнага ліцэя імя Б. Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім. Яе паэтычны твор таксама перамог сярод літаратурных прац. Адзначаны былі таксама вершы Патрыцыі Буркевіч (Комплекс школ з беларускай мовай у Бельску-Падляшскім) — I месца, і Кацярыны Баўтрамюк (Комплекс школ з беларускай мовай у Гайнаўцы) — III месца ды вылучаны творы Адрыяны Прусіноўскай (КШ у Гайнаўцы), Кацярыны Лукашук (КШ у Бельску) і Магдаліны Антасюк (КШ у Бельску).

У катэгорыі „Беларусь у гісторыі маёй сям'і" адзначыліся багатыя зместам і думкамі працы-альбомы: I месцам — Наталлі Мікалаюк (Бельск), II месцам — Аніты Яблушэўскай (Бельск) і Эвеліны Прабуцкай (Нарва, КШ у Гайнаўцы), III месцам — Ганны Грыгарук (Чыжы, КШ у Гайнаўцы). Вылучаны былі працы Пятра Морданя (КШ у Бельску), Наталлі Каўшук (КШ у Гайнаўцы), Ганны Пякарскай (Гімназія № 7 у Беластоку) і найменшых аўтарак — васьмігадовай Юліты Банькоўскай (КШ у Бельску) і Магдаліны Флорчук (ПШ у Дубінах).

Не разглядаліся таксама па ўзроставай катэгорыі працы па намінацыі „Фотаздымак пра Беларусь". Першае месца здабыла Кацярына Нікалаюк (ПШ імя Я. Кастыцэвіча ў Бельску), II — Давід Яблушэўскі (бельскі белліцэй) і Юліі Анішчук (бельскі белліцэй) ды III — Ганна Панфілюк і Дар'я Жарначук (КШ у Гайнаўцы). Вылучаны былі фотаздымкі Паўліны Сячкевіч (КШ у Гайнаўцы), Ганны Ваўранюк (КШ у Бельску).

Найбольш прыйшло мастацкіх прац-„малюнкаў пра Беларусь". Сярод дашкольнікаў перамагла Каміла Анішчук (дзіцячы садок № 14 у Беластоку). Другія месцы занялі Якуб Апольскі (садок № 14) і Патрыцыя Семяцкая (ПШ у Навакорніне), II — Юля Іванюк (садок № 14). Вылучаны былі працы Караліны Палікатус і Патрыка Трашчоткі з ПШ у Навакорніне ды дашкольнікаў з Беластока — Вікторыі Пякарскай, Аркадзя Нікалаюка, Басі Лук'янюк, Ані Карнілюк, Марыі Сіроцкай і Юліты Якімюк. Сярод школьнікаў (7-9 гадоў) самыя першыя былі Аляксандра Яроцкая з Гарадка і Наталля Шварц (КШ у Бельску), другая — Соня Ніна Сульжык з Гарадка (яе партрэт Еўфрасінні Полацкай быў першай працай, якая прыйшла на конкурс), і Агата Усціновіч (ПШ імя Кірылы і Мяфодзія ў Беластоку). Вылучаны былі яшчэ працы вучняў з праваслаўнай беластоцкай школы: сумесны малюнак Зузаны Астапчук, Аляксандра Семенюка, Янкі Шыманскага, Агнешкі Зданоўскай, Агаты Усціновіч, Мартыны Файфа ды Якуба Шараметы, Агнешкі Зданоўскай, Аляксандра Семенюка, Рыгоркі Зінчука і Патрыка Місеюка, а таксама мастачкі з Гарадка Сандры Грыцук і вучняў бельскай „тройкі" — Нектарыя Юрчука ды Максіма Фіёніка. Сярод прац вучняў ва ўзросце 10-13 гадоў перамаглі малюнкі Уршулі Скепка (КШ у Бельску) і бялыпчаніна Якуба Ваўрушэвіча (ён апынуўся на запрашэнні!), II месца атрымаў Валодзя Швайко (ПШ № 4 у Беластоку), II — Марыёла Анішчук (ПШ у Дубінах). Вылучаны былі працы вучняў з Дубін Анны Баўтрамюк, Монікі Максімюк, Анны Грэчань, Патрыка Грэчаня, Марка Самацюка, Крысціны Анджаеўскай і Юстыны Тамашук-Спірыдовіч ды вучаніцы з Гарадка Аляксандры Астапчук. Сярод гімназістаў за малюнак гран-пры здабыла Анна Верамчук (КШ у Бельску) за працу „Палац Радзівілаў у Міры", I месца — Эмілія Анішчук і Паўліна Красоўская (КШ у Бельску), II — Іаанна Леанеўская (КШ у Нараўцы), III — Кацярына Дрозд (КШ у Гайнаўцы), а вылучаны былі яшчэ малюнкі Клаўдзіі Бэдняж (КШ у Гайнаўцы) і Кацярыны Панькоўскай (КШ у Бельску). Гран-пры сярод ліцэістаў у малюнку заваявала Юстына Чыквін (белліцэй у Гайнаўцы), I месца — гайнаўскія белліцэісты Павел Аляксандр Панфілюк і Адам Васільчук, II — Дар'я Лукша і III — Агнешка Рута ды вучаніца ліцэя ў Міхалове Агнешка Буслоўская.

Праца Міхасі Герасімюк з Гайнаўкі — самая вялікая і паказная. Не была паказана ў філармоніі

Конкурс праводзіўся пад патранажам Культурнага цэнтра Беларусі, епіскапа Беластоцка-Гданьскай епархіі, Радыё Беласток і Тыднёвіка „Ніва".

Родам з Беласточчыны

Анатоль Кунцэвіч „СУМНЫ” сумаваў па Радзіме

Сяргей ЧЫГРЫН

У кнізе „З Беластоцкай зямлі” (Беласток 2008) адзін невялікі раздзел я прысвяціў Анатолю Сумнаму. Пры падрыхтоўцы матэрыялу да кнігі мне нават не ўдалося разгадаць, хто хаваўся пад псеўданімам Сумны. Ведаў я толькі тое, што ён нарадзіўся на Беласточчыне, быў прыхільнікам Беларускай Цэнтральнай Рады, падрыхтаваў альманах „Ускалось”, які загінуў падчас бамбардзіроўкі ў Германіі, пісаў вершы. Адзін верш „Маліцьба” ўдалося адшукаць у часопісе „Баявая Ўскалось” (1970, № 10). Але гэта кволы літаратурны твор-настальгія, твор-просьба, твор-самота па Радзіме. Больш-менш удалай атрымалася першая страфа:

Маці святая,
заступніца шчырая,
Я Табе душу сваю адчыняю.
Граець у сэрцы цудоўная ліра,
З ёй гэту песню я сёння складаю...

Пасля Другой сусветнай вайны сляды Анатоля Сумнага згубіліся дзесьці ў Аўстраліі.

Вось і ўсё, што было мне вядома пра чалавека з псеўданімам Сумны. Тым не менш, я пакінуў і гэтыя невялікія звесткі пра яго ў кнізе „З Беластоцкай зямлі”, а таксама ў „Беларускай Беласточчыне” (Мінск 2008). Калі даследчык беларускіх псеўданімаў Янка Саламевіч прачытаў мае кнігі, дык адразу сказаў, што пад псеўданімам Анатоль Сумны хаваецца не хто іншы, як праваслаўны святар Анатоль Кунцэвіч.

Пачаліся новыя пошукі. І за гэты час ужо сёе-тое ўдалося знайсці пра Кунцэвіча-Сумнага. Сабранае па крупінцы дае ўяўленне пра лёс гэтага незвычайнага чалавека і шчырага беларуса.

Анатоль Кунцэвіч нарадзіўся 14 красавіка 1912 года на Беласточчыне, магчыма ў вёсцы Ялоўка. Па іншых звестках ён нарадзіўся 14 чэрвеня ў Пінску. Але гэта малаверагодна, бо ў паваенных дакументах ён сам указваў, што нарадзіўся на Беласточчыне. Бацька яго ў Ялоўцы быў святаром. Там, у Ялоўцы, Анатоль у 1923 годзе скончыў два курсы „учыцельскай прэпаранды” (уступныя курсы перад паступленнем у настаўніцкую семінарыю). І ў 1924 годзе паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. А пасля семінарыі скончыў яшчэ факультэт праваслаўнага багаслоўя Варшаўскага ўніверсітэта. Як бачыце, Анатоль Кунцэвіч у маладосці атрымаў вельмі добрую адукацыю.

Калі юнака забралі на вайсковую службу, служыў ён у 81-м палку пяхоты ў Брэсце. А пасля службы вярнуўся дамоў і прыняў духоўны сан. Пасвяціў яго ў духоўны сан пазнейшы мітрапаліт Аляксандр Іназемцаў у Пінску.

У 1942 годзе Анатоль Кунцэвіч выехаў у Германію. Разам з ім выехалі жонка і двое іх сыноў — Мікола і Юрык, яго брат Мікалай з жонкай, а таксама маці з бацькам. Айцец Анатоль працаваў настаяцелем праваслаўнай царквы ў Нордгайме. Адтуль ён звяртаецца з прашэннем да епіскапа Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Сяргея Ахатэнкі, каб прыняў яго пад ягоную юрысдыкцыю і прызначыў настаяцелем праваслаўнай парафіі пры лагеры ў Гановеры. Хутка яго просьбу задаволілі. І Кунцэвіч быў прызначаны настаяцелем праваслаўнага прыхода БАПЦ у лагеры ДП у Гановеры.

Анатоль Кунцэвіч, 1948 г.

Жонка Анатоля Кунцэвіча

Святарскія абавязкі Анатоль Кунцэвіч выконваў шчыра і аддана. Па хадайніцтве епархіяльнага эканома і сакратара Міколы Дзямідава, пастановай кіраўніцтва БАПЦ ад 2 студзеня 1949 года за вельмі карысную і паспяховую дзейнасць і за арганізацыю царкоўна-прыходскага жыцця сярод праваслаўных беларусаў, протаіерэю Анатолю Кунцэвічу была выказана падзяка і просьба да ўладыкі Сяргея Ахатэнкі узнагародзіць яго чарговай протаіерэйскай узнагародай. А таксама прызначыць Анатоля Кунцэвіча благачынным прыходаў БАПЦ на англійскую зону і даручыць яму далейшую арганізацыю новых прыходаў і часовае адміністрацыйнае кіраўніцтва імі ў англійскай зоне да прызначэння адпаведных настаяцеляў. Гэта была для Кунцэвіча прыемная навіна. І ён з новай сілай узяўся за працу.

Сыны Анатоля Кунцэвіча — Коля і Юрык

Але хутка ўладыка Сяргей пакінуў Германію і выехаў у Аўстралію ў Сідней. За ім выехаў і Анатоль Кунцэвіч. У 1952 годзе ў Сіднеі ўжо дзейнічала парафія БАПЦ, у якой багаслужбы праводзіў святар Зялінскі, да якога далучыўся і протаіерэй Анатоль Кунцэвіч. Там наш зямляк таксама прымаў удзел у працы Беларускага аб'яднання ў Новым Паўднёвым Уэльсе, дапамагаў беларусам багаслужбамі. Але, як і большасць святароў БАПЦ, Анатоль Кунцэвіч мусіў працаваць і яшчэ ў іншым месцы, відаць, займаўся фізічнай працай. А калі ў 1957 годзе ўладыка Сяргей пераехаў у Пэрт, то Кунцэвіч адышоў ад грамадскай беларускай справы і ад царкоўнай.

У пошуках звестак пра Анатоля Кунцэвіча я звярнуўся да свайго земляка Барыса Данілюка з пытаннем, што ён ведае пра яго. Спадар Данілюк сказаў, што чуў пра святара Анатоля, але як склаўся ягоны лёс — ён не ведае. І параіў звярнуцца да яшчэ аднаго земляка Анатоля Храноўскага, які жыве ў Канадзе. Што я хутка і зрабіў. На пытанне: ці ведалі вы Анатоля Кунцэвіча, спадар Храноўскі адказаў:

Браты Мікалай і Анатоль Кунцэвічы (злева направа) са сваімі жонкамі, іх маці з унукамі — сынамі Анатоля, 1947 г.

— Я вельмі ўзрадаваўся, што ёсць яшчэ людзі на зямлі, якія цікавяцца лёсам нашых патрыётаў. Айцец Анатоль Кунцэвіч быў прарокам-прапаведнікам. Гэтага вялікага, мудрага і шчырага чалавека я буду памятаць да самай смерці.

— І якім ён вам на ўсё жыццё запомніўся?

— Успамінаецца нямецкі горад Нордгайм, англійская зона. Я, мае бацька і маці жылі ва ўкраінскім лагеры. Жылі мы там доўгі час. Аднойчы нам паведамілі, што ўкраінцы павінны пакінуць гэты лагер, бо сюды прыязджаюць вайскоўцы-палякі з арміі Андэрса. Але мы засталіся, бо бацька наш быў брыгадзірам у брыгадзе, якая пілавала лес амерыканцам. Яму сказалі заставацца і нас ніхто тут чапаць не будзе. Бацька пагадзіўся і мы засталіся. Праз пэўны час сапраўды прыехалі палякі, а з імі прыехаў і айцец Анатоль Кунцэвіч з жонкай і са сваімі сыночкамі. Мы пазнаёміліся. Аказалася, што айцец Анатоль быў святаром у арміі Андэрса. З ім разам прыехала і шмат беларусаў. Тут мой бацька, айцец Анатоль і іншыя беларусы адкрылі царкоўны прыход БАПЦ. Разам мы святкавалі ўсе царкоўныя праваслаўныя і беларускія нацыянальныя святы. Жылі дружна і весела, спадзяваліся, што хутка вернемся на Бацькаўшчыну.

Сам Анатоль Кунцэвіч быў сапраўдным беларускім праваслаўным хрысціянінам. Трэба было бачыць і чуць, як ён выдатна праводзіў богаслужэнні. А калі казаў пропаведзі — мурашкі бегалі па целе. Гэта было незвычайна. Можа з-за таго, што ён служыў святаром у войску. Крыж ён трымаў высока і моцна прапаведаваў. Бацька яго быў старастам і спяваў у хоры, маці таксама спявала ў хоры. Сам Анатоль ведаў шмат беларускіх песень, умеў добра танчыць, разбіраўся ў танцах, складаў вершы, добра маляваў, пісаў іконы алейнай фарбай. Ён быў вельмі таленавітым чалавекам. Я яму падчас службаў падаваў кадзіла. Ён мяне навучыў з воску рабіць свечкі. Я ўсё ж за яго быў маладзейшы на 22 гады і шмат чаму добраму ў яго вучыўся.

— Але ж па волі лёсу на Бацькаўшчыну вярнуцца ніхто тады не змог. Вы паехалі з сям'ёй у Канаду, а Анатоль Кунцэвіч застаўся. Ці так гэта было?

— У 1949 годзе мы выехалі ў Канаду. Праз некалькі гадоў я даведаўся, што Анатоль Кунцэвіч жыве ў Аўстраліі. У Аўстраліі жыў і Аляксей Васіленя са Слоніма, з якім я перапісваўся. Неяк я ў Васілені спытаўся, што ён ведае пра Кунцэвіча. Спадар Васіленя адказаў, што Кунцэвіч пачаў моцна піць. Я планаваў забраць яго з сям'ёй у Канаду, але ўжо было позна, яго не стала. Мне вельмі шкада Анатоля, ён быў — душа нашага народа...

Да ўсяго вышэйсказанага хочацца дадаць, што Анатоль Кунцэвіч вельмі сумаваў па Радзіме, па роднай Беласточчыне. У пісьмах да сваіх сяброў, з якімі перапісваўся, заўсёды пісаў, што сумуе па Бацькаўшчыне, нават псеўданім сабе ўзяў — Анатоль Сумны. Гэтая настальгія, незваротны жыццёвы адчай дачасна загналі яго ў магілу дзесьці ў 1960-х гадах. Пра лёс ягоных жонкі і сыноў звестак знайсці пакуль не ўдалося.

Курыцу, рыбу і бабу бяруць рукамі — пра традыцыю ў Гацьках

Фота Ілоны КАРПЮК

Калі мы толькі заехалі ў Гацькі „пад павець", дзе мясцовае таварыства „Гай" з сябрамі ладзіць юр'еўскае свята, на месцы сядзела толькі солтыс вёскі Райск Ірэна Тышук з сынам.

— А куды ўсе падзеліся? —пытаемся. — Мы ж спозніліся на гадзіну, а тут людзей не відна.

— Ведаеце, як з гэтым Ванем, яшчэ не было так, каб з усім паспелі.

Дождж яшчэ не ідзе, але хмары нецярпліва кружацца над вогнішчам.

— Ого, я так стаю задам, а за мною бушуюць чорныя хмары, дык напэўна пойдзе дождж.

Толькі спадарыня солтыс скончыла сказ, як пачаў крапіць дробненькі дождж. Добры знак. Такі дождж варожыць, што каровы будуць даіцца ўвесь год, але пападаў і гусцейшы, а гэта мае прынесці буйны плён.

— Гэта ж наша свята, — хвалюецца спадарыня Ірэна, — свята сялян. Мой сын зараз працуе на гаспадарцы, то і яго бяру з сабой. Можа толькі свянцонага яйка бракуе, але думаю, што аднаго і так не хапіла б на ўсіх гасцей.

Схаваліся мы ад дажджу пад паветку, а паўгадзіны пазней пад'ехаў спадар Мікалай, які супольна з паняй Ірэнай рыхтавалі пачастунак, ці лепш нават сказаць, бяседу. Неўзабаве з-за гацькоўскіх узгоркаў паказаўся мікрааўтобус і доўгачаканыя госці.

— Ну, Ваня Юр'ю прывёз!

Праўду кажучы, то і Юр'і з ім не было, але калі пад'ехалі самаходы з расспяванай студзіводскай моладдзю, зразу адчулі настрой свята. Павыходзілі дзяўчаты ў хустках ды клетачных спадніцах, хлопцы ў кашулях-вышыванках як сто гадоў таму, толькі коні сталі механічнымі.

— Мы хацелі карагодам прайсці праз вёску і дайсці тут, на „наша" месца, — расказвае Ваня Мордань, адзін з ініцыятараў гацькоўскага святкавання, — але пайшоў дождж і трэба было памяняць праграму.

Калісь па вёсках сапраўды хадзілі карагоды, дзяўчаты круціліся ў доўгіх спадніцах, бегалі хлопцы. Раніцай пастухі ўпершыню выводзілі жывёлу на пашу, а карагод абыходзіў з караваем усе палі. Ставілі каравай і мералі, ці жыта ўжо яго перарасло, — калі так, гэта прадвяшчала буйны ўраджай збожжа.

— Прабачце, што мы так позна, — тлумачыцца арганізатар Ваня, — але нам зацягнулася ў Фіёнікаў.

— Мы доўга збіраліся, бо спачатку і ў Судзіводах нам трэба было адсвяткаваць, — расказвае Дарафей Фёнік — Дзеці цэлы год чакаюць Юр'я, бо тады абыходзім з караваем сваё збожжа ды яшчэ качаемся ў ім. Хлопцы вельмі рады, што ў нас такая традыцыя.

Традыцыя вельмі хутка аднавілася і ў Гацьках. Калектыў „Жэмэрва" са Студзівод пачаў разагграваць галасы, прабуючы ўсялякія лакальныя песні, а гаспадары хутка пачалі накрываць сталы, на якіх чакала раней ужо падрыхтаваная закуска. Як інакш. Добра, калі на Юр'я дождж акропіць траву, але яшчэ лепш акропіць моцнымі напоямі ўраджайныя сталы. Юр'я — апякун земляробаў, таму і сённяшнія гаспадары пра яго апеку не забываюць — чакаюць ды паважаюць — такім чынам да свята не толькі ўзышла зялёная трава, пачалі квітнець дрэвы, але і свая салата вырасла, якой солтыс Райска частавала прыбыўшых.

— Курыцу, рыбу і бабу бяруць рукамі, — са смехам заахвочвае частавацца раенская солтыс.

— А ў нас тут як у раю, — заўважае Ваня.

І хаця майскае сонца толькі час ад часу выглядала з-за хмар, то атмасфера цяплела з кожнай хвілінай. Не толькі таму, што гаспадары пачалі напаўняць чаркі, а перш за ўсё таму, што вельмі цёпла віталі яны ўсіх і сябе ўзаемна.

— Вельмі цешуся, што памяць пра бога Ярылу, а зараз і святога Юр'я застаецца ў народзе, — стараўся афіцыйна пачаць мерапрыемства шэф „Гаю" Ваня Мордань. — А мяне яшчэ больш радуе, што кожны раз прыязджаюць нашы сябры ды новыя госці.

Зразу пасля першых слоў падняўся і Дарафей Фёнік:

— А мы цешымся, што святкуем з вамі, бо тут, у Гацьках, дзве з паловай тысячы гадоў гаспадараць беларусы! Зараз з гэтай нагоды заспяваем адзіную захаваную юр'еўскую песню, у якой згадваецца гай, — з усмешкай закончыў Дарафей.

„Святы Юр'я, пайдзі да Бога па ключы, выпусці травіцу" і гэтак далей. Як гэты Гай, ручай, што плыў побач святкуючых, паплылі і словы песні. А гутаркі вяліся да ночы. Карагоднікі зіхацелі ў гэты раз за сталом.

Ілона КАРПЮК

Кампутарны слоўнік

Беларускую кампутарную тэрміналогію ствараем мы!

- Дадаць артыкул
- Дадаць слова
- Словы без перакладу
- Кантакт

Не сакрэт, што беларуская навуковая тэміналогія і дагэтуль добра не распрацаваная. Некаторыя зрухі назіраліся напачатку і напрыканцы XX стагоддзя. Многае, канешне, было зроблена падчас гэтых хутка прайшоўшых хваляў беларускага адраджэння, але да сістэматызаванага выкарыстання тых ці іншых навуковых і тэхнічных тэрмінаў так і не дайшло. Цяпер сітуацыя яшчэ больш ускладнілася. Віной усяму — дэбеларусізатарскія намаганні лукашэнкаўскай улады. Акрамя таго і навуковы прагрэс не стаіць на месцы. Таму адсутнасць беларускіх тэрмінаў, якія б былі цвёрда замацаванымі ў навуковай і тэхнічнай літаратуры, зводзіць амаль да нуля выкарыстанне беларускай мовы ў навуцы.

Канец мінулага — пачатак гэтага стагоддзя сталі часам усё больш шырэйшага выкарыстання камп'ютара і ўсяго таго, што звязана з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Нельга сказаць, што беларускай „камп'ютарнай" мовы няма. Разам з тым яе выкарыстанне далёка не такое шырокае, якім яно магло б быць пры падтрымцы з боку беларускіх улад. Таму, як часцяком такое бывае, за працу бяруцца добраахвотнікі, якія і ствараюць даведачныя сайты, накшталт „Беларускага кампутарнага слоўніка", што месціцца па адрасе http://kamputerm.org.

Прэзентацыя сайта, калі яго можна так назваць, змешчана на першай старонцы. Там знаходзіцца артыкул „Праблема фарміравання тэрміналагічных банкаў даных па розных галінах ведаў", дзе чытач на свае вочы пабачыць і зможа параўнаць шматлікія пераклады адных і тых жа рускіх ці англійскіх тэрмінаў на беларускую мову. Такая шматлікасць беларускамоўных тэрмінаў, канешне, не спрыяе дакладнай перадачы інфармацыі, пра што і робіцца асноўная выснова артыкула, які быў апублікаваны яшчэ ў 1996 годзе аўтарам В. К. Шчэрбіным.

„Да таго ж часу, пакуль такія тэрміналагічныя банкі даных па розных галінах ведаў не будуць створаны і ўсе спрэчныя пытанні адносна нарматыўнасці/ненарматыўнасці таго або іншага тэрміна не будуць вырашаны з дапамогай такіх банкаў даных па-сапраўднаму навуковым шляхам, неабходна, каб пазбегнуць тэрміналагічнага разнабою ў спецыяльных даведніках, прытрымлівацца наступных правіл: 1. не ўжываць без пільнай патрэбы штучных тэрміналагічных наватвораў (ліхань замест радыю, друкарка замест прынтэра і да т.п.); 2. адзначаць кожны прапануемы ў слоўніку новы тэрмін адпаведнай абмежавальнай паметай „неал." (неалагізм); 3. друкаваць тэрміналагічныя слоўнікі, у якіх падаецца значная колькасць такіх неалагізмаў-наватвораў, пад шыльдай „Праект" (як, дарэчы, гэта і рабілася ў беларускай тэрмінаграфіі 20-30-х гг.)".

На даным сайце падаецца адразу некалькі варыянтаў перакладзеных з англійскай ці рускай мовы тэрмінаў, звязаных з галіной ІТ. Сюды ўваходзяць як камп'ютарныя тэрміны, так і тыя, што тычацца абсталявання, праграмавання, графікі і вэб-дызайну.

Адметна, што сайт у нечым падобны на Вікіпедыю, бо яго стравальнікі заклікаюць інтэрнэт-карыстальнікаў прыняць удзел у фармаванні „Кампутарнага слоўніка". Для гэтага ў правым вугле выяўлення месцяцца выйсці да сэрвісаў, дзякуючы якім можна дадаць уласны пераклад таго ці іншага тэрміна, альбо, нават, свой артыкул.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

На максімуме

73-ы чэмпіянат свету па хакеі, які прайшоў у Швейцарыі, заняў сваё месца ў летапісе мірных баталій на лёдзе. Бронзавыя медалі заваявалі шведы, якія ў змаганні за 3-е месца адолелі амерыканцаў — 4:2. А чэмпіёнскі тытул дастаўся Расеі, якая ў фінале дасягнула мінімальнай перавагі над Канадай — 2:1. Беларуская ж дружына на гэтым першынстве другі раз у сваёй гісторыі выйшла ў плэй-оф. У выніку дэ-юрэ яна была класіфікаваная восьмай, хоць фактычна падзяліла месцы з 5-га па 8-е. Да ўсяго наша каманда стала найбольш карэктнай на турніры.

У чвэрцьфінальным матчы супраць Расеі падначаленыя Глена Хэнлана далі саперніку сапраўдны бой, але ўсё ж саступілі 3:4 і выбылі з розыгрышу. Першы перыяд не прынёс закінутых шайбаў. А ў другім нашы двойчы выходзілі наперад пасля трапных кідкоў форвардаў Канстанціна Кальцова і Алега Антоненкі, аднак расейцы аднаўлялі парытэт, а потым і выйшлі наперад — 3:2. І ўсё ж беларусы параўнялі лік, рэалізаваўшы колькасную бальшыню пяць на тры — вызначыўся Руслан Салей. Пасля перапынку расейцы памянялі галкіпера і здолелі закінуць у трэцім перыядзе вырашальную шайбу. Дырэктарат вызначыў лепшых хакеістаў зборнай Беларусі па выніках усяго турніру. Імі намінаваныя галкіпер Андрэй Мезін і форварды Міхаіл Грабоўскі і Аляксей Калюжны. Не менш іх заслугоўвалі месца ў гэтай тройцы і ветэраны — нападнік Алег Антоненка, які віртуозна выконваў буліты і абаронец Руслан Салей, прыезд якога істотна ўзмацніў абарончыя шэрагі.

Выступ беларускай дружыны пакінуў двайстае ўражанне. З аднаго боку, нашы ўжо навучыліся годна выступаць з грандамі (прыкладам — два гады запар толькі па адной шайбе прайгралі чэмпіёну — Расіі). Упершыню ў гісторыі дачыненняў на другім этапе была абыграна Фінляндыя. Канадзец Хэнлан навучыў гульцоў дасягаць патрэбны вынік. Каманда выйграла дзве сустрэчы па булітах, а адну ў авертайме, што яскрава сведчыць пра яе моцны характар. І, напэўна, на гэтым першынстве беларусы дасягнулі свайго максімуму. З іншага боку, гульня нашай каманды часцяком была невыразнай, беларусы вельмі мала забілі галоў, цягнулі пры нагодзе час. Прыемным выняткам тут можна лічыць дзеянні нападніка Міхаіла Грабоўскага, які дэманстраваў сапраўднае майстэрства. Плюсам зборнай была традыцыйная надзейнасць на топ-турнірах брамніка Мезіна, прызнанага лепшым галкіперам турніру. Але Хэнлан „эксплуатаваў" пераважна лідараў, праверaных байцоў, а іншая палова калектыву досыць рэдка выходзіла на лёд. Трывожыць і камплектаванне нацыянальнай дружыны, у яе складзе зараз ажно 8 выхаванцаў розных расійскіх хакейных школаў (раней іх было менш!). Рэальна ўзмацніць каманду маглі толькі браты Касціцыны, але малодшы Сяргей быў пасля аперацыі, а старэйшы Андрэй праўдападобна і не гарэў жаданнем выступіць на гэтым чэмпіянаце. Словам, падставаў для эйфарыі пакуль зусім няма. Але прыемна, што ў абноўленым сусветным рэйтынгу Беларусь перамясцілася з 9-й на 8-ю пазіцыю. Зараз на ёй трэба замацоўвацца.

Там жа, у швейцарскім горадзе Берн, на штогадовым кангрэсе міжнароднай федэрацыі хакея адбылося галасаванне па пытанні права правядзення чэмпіянату свету 2014 года. Ужо з першага тура перамагла заяўка Беларусі. За нашу краіну было аддадзена 75 галасоў, 24 дэлегаты выбралі Вугоршчыну. Толькі 3 галасы набрала Латвія і 2 Украіна. Такім чынам першынство свету па хакеі 2014 года ўпершыню пройдзе ў Беларусі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Сустрэча ў родных ваколіцах

— Шчыра кажучы, раней не ведала я, што Уладзімір Саўчук піша, — тлумачыць арганізатар сустрэчы, дырэктар Гміннай публічнай бібліятэкі ў Чаромсе Тамара Кердалевіч. — Аднойчы зайшоў ён у нашу бібліятэку і перадаў зборнікі сваіх вершаў. Даведаўшыся, што з'яўляецца ён аўтарам некалькіх зборнікаў паэзіі, рашыла я запрасіць яго да нас.

Пятніца, 8 мая. Гмінны асяродак культуры ў Чаромсе, 13 гадзіна. Хаця здавалася б, што гэта ненайлепшая пара для аўтарскіх сустрэч, зала тутэйшага асяродка культуры запоўнена, у галоўным вучнямі. Пачынаецца сустрэча з паэтам Уладзімірам Саўчуком.

Сустрэча з ім невыпадкова праходзіць у Чаромсе. Паэт, які штодзень жыве ў Беластоку, нарадзіўся непадалёк, у вёсцы Кузава. У сваёй творчасці (паэт піша на беларускай ды польскай мовах) вельмі часта закранае ён тэму роднай зямлі, малой айчыны, бацькоў. Такі характар маюць таксама вершы аўтарства Уладзіміра Саўчука, якія на пачатку сустрэчы дэкламуюць вучні Пачатковай школы ў Чаромсе.

— Другакласнікі прадстаўляюць польскія вершы, а шасцікласнікі беларускія, — тлумачыць Альжбета Раманчук, настаўніца беларускай мовы ў Пачатковай школе ў Чаромсе, якая рыхтавала дзяцей да сённяшняга выступу.

Пасля свае творы чытае сам аўтар. Сярод іх ёсць вершы на беларускай і польскай мовах, але, як адзначае Уладзімір Саўчук, першай мовай, на якой пачаў пісаць, была беларуская.

— У многіх дзеяннях падказвалі ці дапамагалі мне сябры-„белавежцы", — тлумачыць паэт. — Між іншым Міра Лукша, Ян Чыквін ды іншыя.

Сённяшняя сустрэча для паэта, які выхоўваўся ў гэтых ваколіцах, мае, несумненна, сантыментальны характар. Яе адмысловасць заключаецца таксама ў тым, што гэта першае аўтарскае спатканне Уладзіміра Саўчука ў родных ваколіцах. Як прызнаецца сам паэт, перад ім крышку хваляваўся.

— Прыемна было таксама спаткаць сёння сярод публікі маю настаўніцу з пачатковай школы, — гаворыць пра ўражанні пасля сустрэчы сённяшні госць.

Да гэтай пары Гмінная публічная бібліятэка не ладзіла многіх аўтарскіх сустрэч гэтага тыпу, але, як тлумачыць мне Тамара Кердалевіч, ёсць жаданне, каб падобныя спатканні адбываліся прынамсі некалькі раз у год.

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Мікола КРАЎЧУК

На Антанюку ў Беластоку

Рэжа ў Беластоку ўлада
Усё што ў руку ёй падпада.
Лысы пляц — самы харошы.
А на выразку ёсць грошы.
На Антанюку — агароды,
І для патрэбы, і для моды,
Альтанкі проста — што куды,
Як у раі растуць сады...
Дык трэба агарод забраць,
Дрэвы, кусты павысякаць.
Ёсць тут вялікая патрэба:
Касцёл высокі аж пад неба,
Вуліцы шырэйшымі зрабіць,
Каб нам у метраполіі жыць.
Той лепш задумае, хто знае,
Хто намі кіруе-ўпраўляе.
Той з намі вырашыць, што будзе,
Не трэба думаць табе, людзе!
І набудуюць нам „маркетаў",
А нам плаціць толькі за гэта.
Будзе іх так, што не ступіць.
Добра нам у Беластоку жыць.

Шурыку

Гэта было не без прычыны:
да самай трэцяе гадзіны
тэлевізар усё іграе.
Хто яго ж так аглядае?
Шурык гэтак, брат, напіўся,
п'яны ў ложак паваліўся,
і ўключыўшы тэлік зразу,
так глядзеў, аж да адказу.
Так глядзеў, як і піў.
Святла таксама не гасіў...
Шурык, дам табе параду,
не наракай адно на ўладу,
а вазьмісь за гаспадарку,
а пакінь глыбоку чарку.
І не будзе дома сваркі.
Будзе хлеб, будзе і скварка!

Гарадок прамуе сваіх

Творчасць Анатоля Парэмбскага выявілася толькі ў 2008 годзе, калі Гмінны цэнтр культуры ў Гарадку і гурт „Калоссе" наладзілі аўтарскую сустрэчу з паэтам. Вершы спадара Анатоля вельмі спадабаліся гімназістам, якія з гуртком „Казка", ведзеным у Пачатковай школе ў Гарадку, выступілі з дэкламатарскай праграмай. Паэта ўзрушыла заангажаванасць дзетак і за гэта сардэчна ім дзякаваў. Сустрэча з творчасцю Анатоля Парэмбскага працягвалася таксама на ўроках беларускай мовы ў гімназіі, калі ў школу дайшла, падараваная аўтарам, кніжка яго твораў. „Хвалі лёсу" — зборнік вершаў Анатоля Парэмбскага, выдадзены ў 2008 годзе сынам паэта, на жаль, надта сціплы. Як гаварыў сам аўтар: „Фінансавыя абмежаванні не дазволілі змясціць нават трэцяй часткі падрыхтаваных вершаў. Я стараўся выбіраць творы пра Гарадок, пра блізкае нам, пра тое, што здавалася мне найцікавейшым".

Гарадоцкія гімназісты зацікавіліся кніжкай, асабліва вершамі пра іх мясцовасць, абрады і даўніну. Самыя цікавыя вершы вучні падрыхтавалі на дэкламатарскі конкурс „Роднае слова". Пры падрыхтоўцы шчыра дапамагаў спадар Канстанты Казлоўскі. Ён прынёс вершы, якія „не змесціліся" ў зборнік. Такім чынам на цэнтральным аглядзе Дэкламатарскага конкурсу ў Нараўцы Ася Паплаўская вершам „Шчодры вечар у Мастаўлянах" атрымала вылучэнне, а Лукаш Зіневіч творам „Выкідайце тэлевізары" заняў III месца.

Гарадоцкія беларусы маюць надзею, што сітуацыя памяняецца на лепшае і творчасць Анатоля Парэмбскага будзе ацэнена належным чынам.

Альжбета РАМАНЧУК

Сустрэчы ў пушчы

Адной з нешматлікіх прыемнасцей, якія мне яшчэ засталіся ў жыцці, з'яўляюцца прагулкі на веласіпедзе па Белавежскай пушчы. Катаюся з ранняй вясны да позняй восені. Люблю быць з прыродай сам-насам. Але ў апошнія гады з гэтым усё цяжэй. На пушчанскіх шляхах штораз больш турыстаў-веласіпедыстаў. Часам спыняемся і наладжваем гутарку, але не заўсёды. Я маю звычку, што калі набліжаемся да сябе, падношу правую руку ўверх, а з маіх вуснаў плывуць словы прывітання. Мне ўжо здалёку вядома паляк гэта, ці чужаземец. Самае характэрнае, што палякі наогул узіраюцца з каменным, напружаным тварам. Пераважна адкажуць табе на прывітанне, але яшчэ доўга будуць за табой азірацца, як за нейкім недаразвітым. Зусім інакш паводзяць сябе ў такіх выпадках чужаземцы. Ужо здалёку ўсміхаюцца, вітаюцца, быццам вельмі добрыя знаёмыя. Ад такіх сустрэч цёпла робіцца на сэрцы. Кожны раз пытаю сябе: а калі ў нас людзі будуць адзін аднаму дружалюбнымі? Баюся, што я гэтага часу не дажыву. А так хацелася б яшчэ пажыць нармальна...

Пётр БАЙКО

Адгаданка

								1	2	3	4	5	6	7	8		9	10	11	12	13					
14	15	16						17	18	19	20	21	22	23	24		25	26	27	28	29					

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афганскую пагаворку.

1. тыднёвік або штодзёнка = 11 _ 13 _ 1 _ 21 _ 9 _ 15 _;
2. старадаўняя прылада для катавання, на якой расцягвалі цела віноўнага = 2 _ 17 _ 4 _ 3 _;
3. партал, інтэрнэтная старонка = 18 _ 20 _ 8 _ 19 _;
4. маскоўскі ўладар = 23 _ 24 _ 16 _;
5. установа з прэсцідыжытатарам = 22 _ 10 _ 12 _ 14 _;
6. памежная з Парагваем аргенцінская правінцыя = 6 _ 7 _ 27 _ 26 _;
7. у мяшку яго не ўтоіш = 25 _ 5 _ 29 _ 28 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 15 нумара

Прыстань, мякіш, раўнавага, пурыст, хрэн, Ева, рабіна, пяць, гайка, попел.

Рашэнне: **Пустая кішэнь не вабіць калег.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

Прызванне забытай праўды

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Кожны з таго вялікага бохана, якім было Вялікае Княства Літоўскае, можа штосьці ўзяць для сябе, але мусіў і штосьці дакласці, — перакноваў у Беластоку ў час прамацыйнай сустрэчы з „Кнігай Вялікага Княства Літоўскага" сусветнавядомы мастак, ураджэнец Вільні, сямейнымі вузамі звязаны з абшарам сённяшняй Беларусі прафесар Анджэй Струміла.

„Кніга" (вагой тры з паловай кілаграма), выдадзеная якраз па ініцыятыве прафесара Струмілы, гэта больш за 550 старонак здымкаў, эсэ навукоўцаў і пісьменнікаў, спасылаючыхся на гісторыю ВКЛ (літоўскую, беларускую і польскую), пераплеценая ў скуру і з залочанымі берагамі. У ліку аўтараў апынуліся м.інш. Чэслаў Мілаш, Томас Вэнцлова, Уладзімер Арлоў, Генадзь Сагановіч ці Сяргей Дубавец. Свае нарысы змясцілі таксама беларусы з Беласточчыны гісторык Алег Латышонак і пісьменнік з Крынак Сакрат Яновіч. „Кнігу" адкрываюць рэпрадукцыі першых карт Літвы з 1595 г. і ВКЛ з 1613 г., з 1667 г. і 1653 г. „Мы хацелі, каб гэтая „Кніга" ўзнікла на гістарычных землях ВКЛ. Нашым намерам было прызваць забытую праўду і сплаціць гістарычны доўг", — напісаў у першым з апублікаваных эсэ праф. Струміла. Інтэнцыйны ліст выдання гэтай кнігі яшчэ ў сакавіку 2004 года падпісалі, апрача прафесара, прызнаныя ў свеце пісьменнікі, біяграфічна і эмацыйна звязаныя з ВКЛ: Чэслаў Мілаш і Томас Вэнцлова. Заявілі ў той час: „Паўсталая стагоддзі таму на велізарнай тэрыторыі Усходняй Еўропы дзяржава літоўцаў, палякаў і русінаў стала месцам першай спробы суіснавання народаў, культур і рэлігій на прынцыпах роўнасці і талерантнасці".

Прамоцыю „Кнігі", значыць, сустрэчу з некаторымі яе аўтарамі, папярэдзіла пастаноўка „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына", падрыхтаваная беларускай моладдзю з Беласточчыны і літоўскай з Сейненшчыны пад мастацкай апекай м.інш. Барбары Пякарскай і Аліны Ваўранюк (Згуртаванне „АБ-БА"). Маладыя людзі ў нацыянальных строях прадставілі беларускія ды літоўскія танцы і песні.

Пасля праф. Струміла, цяпер пражываючы ў Мацьковай Рудзе на Сувальшчыне, пераконваў:

— У кожнага з нас ёсць ідэальныя айчыны, так як ёсць ідэальнае мілулае і будучыня.

Успамінаў:

— Я нарадзіўся ў Вільні, мой бацька — у Мінску, бабуля ў Віцебску, мама на поўнач ад Вільні. Так склалася, што я з пакалення бадзяг.

Дадаў:

— Трэба памятаць, што традыцыя Княства гэта супольныя здабыткі і спроба яго прысабечання якой-небудзь нацыяй — немагчымая.

Па-беларуску прафесар Струміла вітаў іншых удзельнікаў сустрэчы. Адзначыў:

— Гэтая кніга ў маёй задуме не была падручнікам гісторыі, а толькі эмацыйнай экспрэсіяй кожнага з аўтараў, якія самі сабе выбралі тэмы.

Беларускія і літоўскія дзеці разам вывучалі свае песні і танцы

Сакрат Яновіч пытаўся:

— Адкуль бярэцца такая заядласць ў прымянянні паняцця шматкультурнасці на Беласточчыне? Добра яшчэ, што ў нас, беларусаў, няма чорнай скуры, бо, наколькі я чуў, у Беластоку б'юць чорных!

Аб стваральніку „Кнігі" ён сказаў:

— Анджэй Струміла, з літоўскім прозвішчам і беларускай мовай, для мяне з'яўляецца жывой святасцю. Гэты адзін чалавек прабуе ратаваць мой народ, ад якога я ўжо стаміўся. Народ, які не любіць сябе самога, не любіць сваёй мовы, сваёй гісторыі, які займаецца гадаваннем дзяцей, а не іх выхоўваннем. Нервуюць мяне мае людзі, іхняя непісьменнасць.

Аб Княстве сказаў:

— ВКЛ гэта першы Еўрасаюз, хаця тыя ў ЕС аб гэтым не ведаюць.

Раней:

— Мой дзед-сталяр, пражываючы ў Крынках, свабодна валодаў пяццю мовамі. А сёння ў маіх Крынках і Беластоку такіх людзей, непісьменных, валодаючых некалькімі мовамі, ужо няма.

Алег Латышонак адзначыў:

— Мабыць, да канца свету будзем з літоўцамі спрачацца дзякуючы каму ўзнікла і дзякуючы каму трымалася ВКЛ. Было яно, аднак, цэласцю і не ўдасца яго падзяліць. (...). ВКЛ было калыскай, у якой паўстаў беларускі народ.

У час прэзентацыі прыкладам усё працягваючыхся спрэчак, аб якіх успомніў Алег Латышонак, было сцвярджэнне, якое прагучала ў час моладзевай пастаноўкі: „Першым уладаром, які задзіночыў літоўскія землі і землі беларускіх княстваў быў Міндоўг. Навагрудак стаў першай сталіцай новапаўсталай дзяржавы".

— Навагрудак быў першай сталіцай, але гэта ідэя беларусаў. Літоўцы не могуць з ёю пагадзіцца, — заявіў Рустыс Кумантавічус з Універсітэта Вітаўта Вялікага ў Коўне.

Прафесар Анджэй Струміла і Сакрат Яновіч

„Кнігу ВКЛ" выдаў Фонд „Пагранічча" ў супрацоўніцтве з Асяродкам „Пагранічча — мастацтваў, культур і народаў", кіраваным Кшыштафам Чыжэўскім. Выданне фінансава падтрымала Падляшская маршалкоўская ўправа. У сустрэчы асабіста ўдзельнічалі намеснікі прэзідэнта горада Беластока Аляксандр Сасна і Тадэвуш Арлуковіч ды сенатар ад ПіС Багдан Пашкоўскі, а вёў яе разам з Кшыштафам Чыжэўскім падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі. Шкада толькі, што „Кніга" наўмысля стала рарытэтам і ў паўсюдным абароце яна недаступная.

17.05 — 23.05

(22.03. — 20.04.) Не слухай тых, хто абяцае цуды і рассцілае перад табой цудоўную ўяву будучыні. Будзеш мець сілу змагацца за сваё шчасце. З 22.05. (да 26.05.) цяжкі выбар паміж уласнымі інтарэсамі і чаканнямі, а патрэбамі блізкіх; нявыгадны кампраміс.

(21.04. — 21.05.) 18-22.05. зайздрасць можа моцна папсаваць твае лады з калегамі. З 23.05. добры час для інвеставання. З 22.05. — дэкада паправы ў фінансах. Хоць ненайлепшы настрой (не абцяжарвай іншых сваімі праблемамі).

(22.05. — 22.06.) 18-22.05. пераканаешся, што ў ілжы кароткія ногі (лепш сам прызнайся да памылкі). 19-23.05. можаш стаць аб'ектам кпін і вострай крытыкі; узлуеш атачэнне сваёй нахабнасцю. Пад канец тыдня можаш брацца за самыя складаныя праблемы.

(23.06. — 23.07.) Старайся не вырашаць важных спраў, бо можаш стаць ахвярай ашуканства. Павялічыцца лік тваіх знаёмых. Можаш аднавіць старыя знаёмствы са школы. Чакаеш поспеху — дзейнічай адважна. Партнёр зайздросны, схоча кантраляваць кожны твой крок.

(24.07. — 23.08.) 17-18.05. твае ідэі ўсё геніяльныя! Але не лічы, што ты беспамылковы. Асабліва да 19.05. прыдасца табе больш самакрытыцызму. Не слухай хітрых дарадчыкаў. Каля 20.05. арганізуй камерныя сустрэчы. Прыдаліся б табе масаж алейкамі, аклады з глінкі ці баравіны.

(24.08. — 23.09.) Добры час на падарожжы. Хоць 18-22.05. будзеш рассеяны, няўважлівы, лянівы. Ды і з 19 да 23.05. ніхто не будзе ад цябе лепшым хвальком і не задзярэ вышэй цябе нос! А твая балбатлівасць можа вывесці з нерваў нават найбольш цярплівых. І страшныя сцэны зайдрасці распаліць Ліліт 18-22 мая!

(24.09. — 23.10.) 11-22.05. песімістычны настрой, сумненні, непаладкі ў пачуццёвых справах. Не рабі ў гэты час нічога такога, каб пасля не шкадаваць. У фінансах пазбягай рызыкі. Самотныя Шалі чакае знаёмства з кімсьці надта прываблівым!

(24.10. — 22.11.) На працы дбай аб мілую атмасферу, услухвайся ў людзей. Не ўсе сюрпрызы будуць на тваю карысць, але даведаешся, на чым стаіш. Будзеш дзейнічаць адважна. Праекты зрэалізуеш хутка і з поспехам. Могуць змяніцца твае прыярытэты. У фінансах усё ж згорнеш увесь выйгрыш!

(23.11. — 22.12.) Шмат спраў пойдзе лепш чым па тваёй думцы, выплывеш на шырокія воды, хоць не заўжды абраны напрамак акажацца быць найлепшым. 21-25.05. адкрыюцца новыя шанцы. Атрымаеш важную інфармацыю. Добрыя весткі мабілізуюць. Хоць 19-23.05. рассеянасць, нервовасць. Легкадумны падыход да грошай можа ўвесці цябе ў клопаты!

(23.12. — 20.01.) З 17 мая адкрыюцца перад табой новыя магчымасці. Планаваны выезд удасца. Сустрэнеш цікавых людзей, якія адменяць тваё жыццё. Праблемы, якія могуць паявіцца, перачакай.

(21.01. — 19.02.) Выкажашся вялікім спрытам і інтэлігентнасцю. Пачуццё гумару, здаровы падыход да спраў, аптымізм які падлечыць і атачэнне. Многа энергіі. Ахвота памяняць адосіны да некаторых спраў і людзей.

(20.02. — 21.03.) 17-19.05. лёгка з'яднаеш да сябе іншых. Вялікая энергія, пераканаўчасць. Хоць 18-22.05. неспакой, фрустрацыя, пачуццё бяссілля. Да 19 мая замяшанне, нядобрая кан'юнктура. Ды Марс і Венера прадвяшчаюць дабрабыт і спакой ды паправу іміджу!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960